Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 3 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 194 (4738)

Год выданьня XVII

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Майстры і начальнікі цэхаў Гомельскай прамысловасьці, сабраўшыся на сваю вытворчую канфэрэнцыю, шлюць табе, тав. Гікало, палкае таварыскае прывітаньне!

Тав. Гікало, рэзкую ацэнку, даную ліпеньскім пленумам ЦК рабоце нашай прамысловасьці, мы лічым цалкам заслужанай: мы дрэнна працавалі ў першым паўгодзьдзі і прадаўжаем яшчэ адставаць у выкананьні нашай вытворчай праграмы, на даўшы пералому і ў першы месяц другога паўгодзьдзя. Мы ўсе ўсьведамляем сур'ёзнасьць становішча — тое, што мы засталіся на апошнім месцы па выкананьні прамфінпляну, зьяўляецца ганьбой для пралетарскага Гомелю.

Зразумела, так далей прадаўжацца ня можа. Мы даем табе, тав. Гікало, слова, моцнае слова майстра і начальніка цэху, што мы прыкладаем усе нашы сілы, наша ўменьне, веды, арганізаторскія здольнасьці і вылядзем у бліжайшы час пралетарскі Гомель з ганебнага становішча і завяюем пачэснае месца ў перадавых радох прамысловасьці Беларусі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРАВАДЫР І АРГАНІЗАТАР МІЛЬЁННЫХ МАС САВЕЦКАГА САЮЗУ — ТАВ. СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КІРАЎНІК САЦБУДАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ — ЦК КП(б)Б І ЯГО ПЕРШЫ САКРЭТАР — ТАВ. ГІКАЛО!.

ПРЭЗЫДЫУМ КАНФЭРЭНЦЫІ.

АБ ЗЬНЯЦЬЦІ ДЫРЭКТАРА САУГАСУ „ГІГАНТ" тав. КАСЬКО

Пастанова ЦК УсеКП(б)

Прызнаць няправільным загад Наркамсаўгасаў т. Юрэвіча ад 16 жніўня, які матывуе зьняцьце дырэктара саўгасу «Гігант» тав. Касько кепскім станам яго здароўя, у той час, як у сапраўднасьці т. Касько зьнят за кепскую працу на ўборцы і збожжаздачы саўгасу.

А таму ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Скасаваць загад Наркамсаўгасаў аб т. Касько, як утойваючы сапраўдную прычыну зьняцьця з паста тав. Касько і тым самым перашкаджаючы правільнаму выхаваньню кадраў.

2. Зьняць т. Касько з паста дырэктара саўгасу «Гігант», з прычыны таго, што ён ня справіўся з ускладзенымі на яго партыяй і ўрадам задачамі.

ЦК УсеКП(б).

Усё збожжа, да апошняга зерня, захаваць ад псаваньня і раскрадваньня

У рэзультаце буйных посьпехаў, атрыманых нашай партыяй у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і саўгасаў, у павышэньні працоўнай дысцыпліны і прадукцыйнасьці працы ў сельскай гаспадарцы; у рэзультаце вырасшай палітычнай актыўнасьці лепшых элементаў саўгасаў і калгасаў у барацьбе супроць недабітых рэшткаў клясавага ворага і антыграмадзкіх элементаў—лодыраў, рвачоў, злодзеяў, дармаедаў,—уборка збожжа ў гэтым годзе праходзіць увогуле часьпяхова. Страты збожжа, дасягнутыя ў мінулыя гады пры ўборцы вялізарных разьмераў, у гэтым годзе ў вельмі і вельмі многіх раёнах зьведзены на нішто. Мільёны калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, ад зусім старых дзядоў і да юных піянэраў, узьняліся ў гэтым годзе па барацьбу са стратамі, на ахову грамадзкага ўраджаю ад псаваньня і раскрадваньня. У непасрэднай, арганічнай сувязі з гэтымі вялізарнейшага значэньня фактамі, якія паказваюць хуткі рост сацыялістычнай сьвядомасьці ў калгасных масах, знаходзяцца і высокія тэмпы збожжазаставаў бягучага году. **У адрозьненьне ад усіх мінулых год вялізарныя масы збожжа пашлі гэтым летам на дзяржаўныя элеватары і ссыпныя пункты з першых-жа дзён ўборкі,** і сёньня мы налічваем ужо нямала рэспублік, краёў і абласьцей, дзе гадавыя пляны збожжаздачы дзяржаве выкананы на палову, а то і на дзьве трэці і па чатыры пятых. Як-жа ў сьвятле гэтых сапраўды зьвіўляючых посьпехаў выглядаюць паводзіны людзей, якім партыя і ўрад даверылі прыёмку і зьбераж**эньне паступ**аючага ад саўгасаў і калгасаў збожжа, якія палец аб палец ня ўдарылі, каб узорна арганізаваць даручаную ім справу. Мы маем па ўвазе работнікаў многіх нашых ссыпных пунктаў, элеватараў, работнікаў чыгуначнага і воднага транспарту і, нарэшце, некаторых кіраўнікоў раённых, абласных, краёвых і рэспубліканскіх партыйных і савецкіх арганізацый.

Сярод апошніх, як паказвае ход уборкі і збожжазаставаў, нямала людзей, якім, папросту кажучы, дзяржаўны падыход да справы зьяўляецца чужым. То яны разьвіваюць рантам нястрыманы спрыт, ва-ўсю падганяючы касьбу збожжа, ня толькі не пярэчачы, а наадварот—прымушаючы касіць пявысьпеўшае збожжа, не зварачаючы ніякай увагі на вязку снапоў, на сьціртаваньне. І гэту цыёнкую гарачку фальшыва пасьпяваюць «сацыялістычным спаборніцтвам».

То рантам усе помыслы і ўсе імкненьні такога гатунку «кіраўнікоў» накіроўваюцца на нездаровую пагоню за процантам збожжаздачы, за хвасьлівым рантам аб звыштэрміновым выкананьні пляну збожжазаставаў і ў пылу гэтага хваравітага рэкордсмэнства зноў ляцяць да ўсіх д'яблаў усе астатнія работы і ўся барацьба са стратамі. Плююць на сьціртаваньне, плююць на збор калосьсяў, на прасушку збожжа, на якасьць абмалоту, гоняць на ссыпныя пункты сырое і вільготнае збожжа, робяць усякія жульніцкія махінацыі, залічваючы натураплату МТС у лік збожжазаставаў дзяржаве і інш., з аднэй мэтай—толькі-б хвастануць, пусьціць пыл у вочы, нашумець і праславіцца. Але ка-му патрэбны такія «перамогі» і ўся гэта хлапчукоўская шустрасьць людзей, якія прыстаўлены да дзяржаўнай справы, але тым ня менш пачаўшых шкодзіць, антыдзяржаўную «гульню»? Сьпіхнуць з плеч абавязацельствы па збожжазастаўках, зусім ня лічачыся з тым, якой якасьці здаваемае збожжа, дзе яго склясьці так, каб яно не псавалася, як арганізаваць ахову, каб яго не раскрадвалі. Чыя гэта лінія? Ва ўсякім выпадку гэта лінія не дзяржаўных людзей і не ў інтарэсах дзяржавы праводзімая. Арганізаваць збожжазастаўкі—гэта зусім ня значыць толькі падналягчы на вывяз збожжа на ссыпныя пункты, а гэта значыць разам з тым, **што трэба пабудаваць цьвёрды план вывазу збожжа, сурова кіруючыся тэрмінамі паставак, зацьверджанымі ўрадам і ЦК партыі з тым, каб не ствараць простага затору на пунктах, каб не разгружаць збожжа дзе папала, не пакідаць яго пад адкрытым небам, каб загатовіць, мабілізаваць і прывесьці ў належны парадак усе прыгодныя для захоўваньня збожжа склады і памяшканьні, арганізаваць яго ахову, тэхнічны нагляд за захаваньнем збожжа і г. д.**

Якраз у гэтым заключаецца баль шавіцкая арганізацыя збожжаздачы. Усё гэта можна зрабіць, трэба толькі, каб кіраўнікі раёнаў, краёў і абласьцей, сакратары партыйных камітэтаў і старшыні выканкомаў цьвёрда ўсьвядомілі, што выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай зусім не абмяжоўваецца здачай збожжа на ссыпныя пункты, а ўключае ў сябе арганізацыю аховы і зьбераж**эньня** ўсяго дзяржаўнага збожжа да апошняга зерня, якое знаходзіцца на тэрыторыі гэтага раёну, краю і вобласьці. І калі мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі возьмуцца за гэту справу сапраўды па-бальшавіцку, то ніякага сумненьня быць ня можа, што барацьба са стратамі збожжа будзе сапраўды даведзена да пераможнага канца. Тут трэба рэкамэндаваць, шырэй распаўсюджаць вопыт Крыму, дзе ў мясцох найбольшага скапленьня збожжа, асабліва ня ў складах, уведзен інстытут часовых камэндантаў, з падначаленьнем ім вартавой аховы. Гэта, зразумела, ня значыць, што з загадыкаў элеватарамі і ссыпнымі пунктамі зды маецца хаця-б у якой-небудзь меры адказнасьць за ахову і захаваньне збожжа. Яны адказваюць цалкам і поўнасьцю і ў першую галаву. Камэнданты-ж дапамагаюць арганізаваць вартавую ахову, наладзіць яе службу, правяраць пасты і г. д. Але і увядзеньнем камэндатур нельга вычарпаць барацьбу за ахову і захаваньне збожжа. Нам здаецца, што той шырокі масавы рух за ахову збожжа на палёх, які ў гэтым годзе разгарнуўся ў саўгасах і калгасах, неабходна распаўсюдзіць яшчэ далей, пераняўшы яго да элеватараў, ссыпных пунктаў, складаў, сьвірнаў, чыгуначных станцый, партоў і прыстаняў. Прычым асабліва вялікую ролю тут можа і павінен адыграць камсамол. Побач з бліскучымі ўзорамі арганізацыі, напрыклад, па Краснаўфімскім ссыпным пункце Уральскай вобласьці, дзе ўсё зроблена і прадугледжана да дробязяй, дзе здатчыкаў збожжа сустракаюць, як жаданых гасьцей, праяўляючы выключную клапатлівасьць і ўвагу да кожнага з іх, няма ла такіх элеватараў і ссыпных пунктаў, як, напрыклад, у Віньніцкай вобласьці (гляді «Правду» ад 31 жніўня); збожжаздатчыкаў тут затрымліваюць па некалькі сутак, ня робячы з імі разьлікаў, ня выдаючы квітанцый, прычым нават элементарнае абслугоўваньне збожжаздатчыкаў зусім не арганізавана. Селянін ня можа дастаць ні вару, ні кутка, дзе-б пераначаваць, ні купіць чаго-небудзь у ларку. За такія бяздушныя адносіны да калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, якія здаюць збожжа дзяржаве, вінаватых трэба выганяць з партыі і аддаваць пад суд. Нарэшце, апошняе ды таньне—**аб унясеньні натураплаты МТС. Мы з пачатку гаварылі аб жульніцкіх маніпуляцыях, калі некаторыя мясцовыя арганізацыі, жадаючы бліснуць процантам збожжазаставаў, залічваюць у збожжазастаўкі здаваемую калгасамі натураплату МТС. Аб чым гаворыць гэтыя факты? Тут нельга зьвесьці ўсю справу толькі да хлестакоўшчыны некаторых раённых работнікаў. Справа гэта значна сур'ёзьней, і сутнасьць падобных адносін да натураплаты ў тым, што за ўсімі фактамі адсоўваньня на задні плян натураплаты МТС хаваецца кулацкі заціск супроць узмацненьня ўплыву МТС на арганізацыю калгаснай вытворчасьці.** Не падлягае ніякаму сумненьню, што якраз па гэтай лініі мы будзем мець найбольшае кулацкае супраціўленьне ня толькі ў гэтым, але і ў будучым годзе, бо справа тут ідзе аб барацьбе за вышэйшую форму арганізацыі калгаснай вытворчасьці на базе дзяржаўных сродкаў вытворчасьці. І гэты год, калі ўпяршыню МТС перайшлі ў сваіх разьліках з калгасамі да далявога аблічэньня ад валавога ўраджаю, зьяўляецца **сур'ёзным экзамэнам для МТС, для ўсёй сыстэмы органаў Наркамзему.** Вось чаму зусім нецярпімы ўсякія прымірончыя адносіны да выпадкаў несваячасовага і пяспраўнага ўнясеньня калгасамі натураплаты МТС, як і ўсякія агідныя маніпуляцыі, умаляючыя палітычнае і гаспадарчае значэньне гэтай натураплаты.

(Скарочаны перадавы артыкул «ПРАВДЫ», перададны па радыё).

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ АЗІМАЙ СЯЎБЫ

ПЕРШЫМ У РЭСПУБЛІЦЫ

ПОЛАЦАК, 2.

КАЛГАС «ЧЫРВОНАЕ ГАРАДЗІШЧА», ПОЛАЦКАГА РАЁНУ (ТУРАЎЛЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ), ПЕРШЫМ У РАЁНЕ І Ў РЭСПУБЛІЦЫ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ АЗІМЫХ. ПЛЯН ВЫКАНАН ДА 31 ЖНІЎНЯ. ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ ДОБРАЯ.

ЗАРАЗ КАЛГАСЬНІКІ АПРАЦОЎВАЮЦЬ 2 ГА ДАЛІНЫ ДЛЯ ЗАСЕВУ АЗІМАГА ЖЫТА ЗВЫШ ПЛЯНУ.

АДНАЧАСОВА КАЛГАС РАЗГОРТВАЕ ЗЯЎЛІВА І ВЫЛІЧЫЎ БРЫГАДУ ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ Ў СЯЎБЕ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ ШЛЯХ».

А СЯВЯРКІ ІРЖАВЕЮЦЬ

ПОЛАЦАК, 1. Паасобныя калгасы злачынна ігнаруюць радковую сяўбу. У калгасе «Парыская Камуна», Шацілаўскага сельсавету брыгадзіры Гарбаценка і Лакомскі засеялі 10 гэктараў азімага жыта ўручную. І гэта ў той час, калі тут-жа, пад адкрытым небам стаяць 2 зусім спраўныя радковыя сявяркі.

Сабатуюць радковую сяўбу і ў калгасе «Чырвоная ніва», Пушнікоўскага сельсавету.

Старшыня гэтага калгасу заяўляе, што «рукамі сеяць хутчэй», Пад заслонай гэтых кулацкіх разважаньняў радковыя сявяркі стаяць і не выкарыстоўваюцца. **(БЕЛТА).**

СЯЎБА ПАД УДАРАМ

ВОРША, 1.

Сяўба азімых у раёне праходзіць зусім нездавальняюча. Асабліва трывожнае становішча з сяўбой азімай пшаніцы. Раён павінен засеяць у гэтым годзе 1.939 гэктараў азімай пшаніцы.

Тэрміны сяўбы мінаюць, а на сёнешні дзень у раёне засеяна толькі... 11 гэктараў. Гэта красамоўна сьведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі не разгарнулі сапраўднай барацьбы з кулацкім сабатажом азімай пшаніцы.

Усяго ў раёне засеяна 2.891 гэктар азімых і гэта ў той час, калі па пляну Аршаншчына павінна засеяць 26.739 га.

У радзе калгасаў сяўба азімых толькі-толькі пачынаецца. У калгасе «Парыская Камуна» на сёнешні дзень засеяна ўсяго 6 гэктараў, пры плянавым заданьні ў 250 га.

Калгас «Перамога» з 200 гэктараў, установленых пасеўным плянам, засеяў на сёнешні дзень толькі 7 га.

Сабатаж сяўбы павінен быць неадкладна і рашуча зломлен. **(БЕЛТА).**

НАВАТ ПЛЯНАЎ НЕ ДАВЯЛІ...

ТАЛАЧЫН, 2. (Ад нашага карэспандэнта).

Раён павінен засеяць 24.500 гэктараў азімых. Сваячасовая сяўба ў раёне, аднак, пастаўлена пад удар. Уся справа пушчана на самацёк.

Райземаддзелу мае, літаральна, ніякага ўяўленьня аб ходзе сяўбы на раёне. І гэта ня дзіўна. Адкуль райземаддзелу ведаць, як выконваюцца пляны па сяўбе, калі ён яшчэ нават ніяк не зьбіраецца давесьці пасеўныя пляны да калгасаў многіх сельсаветаў.

Калгасы Друцкага, Скуратаўскага і іншых сельсаветаў, напрыклад, яшчэ і цяпер **НЯ МАЮЦЬ** дакладных пляноў па сяўбе азімых.

Гэта разьвязала рукі апартуністычным элементам, якія імкнуцца скараціць пасеўныя плошчы пад збожжавымі.

Для прыкладу ўкажам на калгас «Новы быт». Праўленьне гэтага калгасу падрыхтавала і мяркуе (толькі мяркуе!) засеяць **30 гэктараў.** У сапраўднасьці-ж калгас «Новы быт» можа і абавязан засеяць ня менш **60** гэктараў азімых.

Апалёгічныя факты маюць месца і ў іншых сельсаветах, але ніякіх меры яшчэ і зараз ня прыняты.

Зварачае на сябе ўвагу ніжая якасьць апрацоўкі глебы. Ёсьць ня мала калгасаў, дзе паўторнае ворыва чыстых папараў не праведзена. У калгасе «Ўдарнік», напрыклад, сеюць па зусім дрэнна апрацаванай, часам проста не ўзаранай глебе.

Рэзка адчуваецца стаўка на апартуністычную чарговасьць кампаній. У Круглянскім сельсавеце, напрыклад, адкрыта заяўляюць, што «трэба скончыць спачатку ўборку і абмалот, а потым ужо брацца за сяўбу».

Апалёгічнае становішча і з зяблевам. Толькі паасобныя калгасы, а іменна калгасы «Іскра» і імя Галадзеда прыступілі да ворыва. Па іншых калгасах зямля яшчэ не кранута плугам.

Чым усё-ж займаюцца раённыя кіраўнікі?

А. Ч.

ЗЬЛЁТ КАЛГАСНАЙ ДЗЕТВАРЫ—УДАРНІКАЎ БАРАЦЬБЫ СА СТРАТАМІ

РАГАЧОЎ, 1. (Па тэлеграфу ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

ПАЛІТАДДЗЕЛ МТС ПРАВЁЎ ПЕРШЫ Ў РАЁНЕ ЗЬЛЁТ ПЕРАДАВОЙ КАЛГАСНАЙ ДЗЕТВАРЫ, піянэраў і школьнікаў — удзельнікаў масавага збору калосоў і лепшых ударнікаў аховы калгаснай маёмасьці.

У рабоце зьлёту прынялі ўдзел 62 дэлегаты. Піянэрка **НІНА ПАЛЯВАЯ** з калгасу Друць расказала зьлёту, як яна разам з калгаснымі піянэрамі сабрала на палёх каласоў на 3 цэнтнэры збожжа.

Зьлёт выклікаў піянэраў і школьнікаў Жлобінскага раёну на сацыялістычнае спаборніцтва па барацьбе са стратамі і ахове калгаснага ўраджаю.

ПРАЗАСЯДАЛІ...

РЭЧЫЦА, 31. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Раён павінен быў загатовіць за жнівень 340 тон бульбы, з якіх адгрузіць 300 тон рабочым Ленінграду.

На пытаньне, што робіць райвыканком па сваячасовай адгрузцы бульбы, старшыня РВК т. **САЎКОЎ** адказвае:

— З такімі пытаньнямі ідзеце да каго-небудзь іншага. Што робім? Засядаем, выяжджаем, хутка яшчэ раз выедзем заслухоўваць сельсаветы...

Старшыня раённага выканкому мае рацыю. Людзі засядаюць з вялікай ахвотай. Нарадам, пасяджэньням ня відаць канца. Ня відаць, аднак, і справы. Раён ганебна **ЗРЫВАЕ** адгрузку бульбы Ленінграду.

На сёнешні дзень **ЗАМЕСТ 300 ТОН,** Ленінграду адгружаны толькі **94 ТОНЫ.** Жнівеньскі плян выканан усяго на 25 проц.

Рэзка кідаюцца ў вочы гніла-ліберальныя адносіны да кулака, які сабатуе бульбаздачу. Кулацкія гаспадаркі павінны былі здаць у жніўні 236 цэнт. бульбы, а здалі толькі... 3 цэнт. З кулацкім сабатажам не вядзецца літаральна ніякай барацьбы.

У цэлым радзе сельсаветаў бульба пастаўкі фактычна зусім не пачыналіся. Нічога, напрыклад, ня здана ў Нахаўскім сельсавеце. У Дзюрдзеўскім, Балашоўскім і іншых сельсаветах месячныя пляны выкананы ўсяго ад 2 да 6 проц.

Такое становішча тым больш ганебна для раённай арганізацыі, што паасобныя сельсаветы, якія сапраўды разгарнулі масава-растлумачальную работу, дабіліся высокіх паказальнікаў. Дзесяхоўскі сельсавет, напрыклад, яшчэ да 25 жніўня выканаў месячны плян па бульбапастаўках на 187 проц., Васілевіцкі—на 110,2 проц. і г. д.

Але гэтыя факты—выключэньне. У раёне засядаюць і ня бачаць за сваімі бясконцымі пасяджэньнямі, што бульбапастаўкі пастаўлены пад удар.

АБ ХОДЗЕ УБОРКІ, АБМАЛОТУ І ЗБОЖЖАПАСТАВАК У АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ

ПАСТАНОВА СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Уборка, абмалот і пастаўкі збожжа дзяржаве паводле даных на 15-VIII—1933 г. у аднаасобным сэктары значна адстаюць ад калгасаў і гэтым самым у значнай меры вызначаюць адставаньне БССР у выкананьні пляну ўборкі і збожжапаставак.

Побач з раёнамі Веткаўскім, Бабруйскім, Камарынскім, Гомельскім, дзе ўборка, абмалот і збожжапастаўкі па аднаасобным сэктары не адстаюць ад калгасаў, у вялікай колькасьці раёнаў, як Гарадоцкі, Вузьдзенскі, Прапойскі, Чачэрскі, Ельскі і Нараўлянскі, мае месца яўнае ігнараваньне аднаасобнага сэктару і па сутнасьці ніякай сур'ёзнай арганізацыйнай і палітычнай работы сярод аднаасобнікаў не вядзецца, а ў радзе месц дапушчаецца голае адміністраваньне.

ЦК і СНК прапануюць усім райкомам і райвыканкомам неадкладна разгарнуць рашучую барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай аднаасобніка, забясьпечыўшы выкананьне пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб дапамозе ў арганізацыі ўборкі, абмалоту і збожжапаставак дзяржаве ў аднаасобным сэктары. У прыватнасьці, павінна быць аказана практычная дапамога кожнай у паасобку дзесяцідворцы шляхам: складаньня падрабязных (сутачных) пляноў уборкі, абмалоту і вывазкі збожжа дзяржаве, устанаўленьня штодзённага кантролю за выкананьнем гэтых пляноў дзесяцідворкай і кожнай гаспадаркай у паасобку, правільнага скарыстаньня наяўнага ў дзесяцідворцы с.-г. інвэнтару, транспарту і коняй, арганізацыі бесьперабойнай вывазкі снапоў з поля і абмалоту збожжа аднаасобнікаў.

Асабліва важна правільнае скарыстаньне наяўных у дзесяцідворках коняй для бесьперабойнай вывазкі снапоў з поля і збожжа дзяржаве бясконнымі аднаасобнікамі. У выпадку неабходнасьці раённыя камітэты партыі і райвыканкомы павінны дагаварыцца з калгасамі аб аказаньні імі дапамогі аднаасобнікам у вывазцы збожжа.

ЦК і СНК абавязваюць райкомы і райвыканкомы тых раёнаў, дзе процант аднаасобнікаў яшчэ вельмі значны, для вядзеньня масавай палітычнай і арганізацыйнай работы ў аднаасобным сэктары прымацаваць ня менш паловы ўсяго раённага і сельскага актыву.

Адзначаючы, што сярод часткі аднаасобнікаў назіраецца імкненьне заразжа пасьля ўборкі свайго ўраджаю ўступіць у калгас з тым, каб правесьці асеньнюю сяўбу і зяблевае ворыва ў калгасе, ЦК абавязвае РК і палітаддзелы рашуча пакончыць з самацёкам, які мае месца ў калгасным будаўніцтве па радзе раёнаў, і з мэханічным, а ў паасобных выпадках недапушчальна бяздушным падыходам да аднаасобніка, заяўляючага аб жаданьні ўступіць у калгас. Неабходна ўсялякім чынам дапамагчы добрасумленным аднаасобнікам, якія акуратна выконваюць план збожжапаставак, уступіць у калгас, рашуча зьнішчаючы спробы паасобных праўленьняў калгасаў абмежаваць да вясны прыём новых членаў.

Пры гэтым ЦК зварачае асаблівую ўвагу райкомаў і палітаддзелаў на тое, каб нова-уступіўшыя гаспадаркі атрымлівалі работу ўжо ў гэтым годзе наравні са старымі калгасьнікамі.

ЦК і СНК асабліва падкрэсьліваюць неабходнасьць дасканалага, няўхільнага правядзеньня ў жыцьцё пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб парадку ссыпкі фондаў для патрэб калгасаў і разьмеркаваньня збожжа паміж калгасьнікамі па працаднёх» (апублікавана ў газэце «Известия» 3-VIII—1933 г.). У выпадку неабходнасьці ЦК і СНК лічаць магчымым дазволіць паасобным аднаасобнікам, поўнасьцю выканаўшым свае абавязацельствы па збожжапастаўцы, уступіць у калгас з неадкладным укараненьнем насеньня толькі на азімую сяўбу; насеньне, якое прыпадаецца з гэтых гаспадарак на яравую сяўбу, павінна быць утрымана калгасамі з прыбыткаў (па працаднёх) гэтых гаспадарак у бягучым годзе.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

ХОД ЗБОЖЖАЗДАЧЫ

ДА 1 ВЕРАСЬНЯ ГАДАВЫ ПЛЯН ПА ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ ВЫКАНАН НА 35,2 ПРОЦ., А ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН НА 158,3 ПРОЦ.

ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА ІДЗЕ ЗДАЧА ПА КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРКАХ, ЯКІЯ ВЫКАНАЛІ ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ ЎСЯГО НА 5,3 ПРОЦ. ГЭТА СЬВЕДЧЫЦЬ АБ НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЙ БАРАЦЬБЕ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ.

ТРЭБА З УСЕЙ СІЛАЙ ПАДКРЭСЬЛІЦЬ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ ХОД ПАТУПЛЕНЬНЯ НАТУРАПЛАТЫ ЗБОЖЖАЗДАЧЫ ПА САЎГАСАХ.

УЗОРНАЯ РАБОТА

ЖЛОБІН, 31.

ВЁСКА ГОРКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫКЛАДНАЙ У РАЁНЕ. ЯНА СУМЛЕННА ВЫКОНВАЕ СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

ГАДАВЫ ПЛЯН ПА ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ ВЫКАНАН ПОЎНАСЬЦЮ ДА 1 ВЕРАСЬНЯ. ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ПА БУЛЬБАПАСТАЎКАХ ВЫКАНАН НА 200 ПРОЦ.

ГЭТА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВЫНІКАМ ШЫРОКАЙ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ, РАЗГОРНУТАЙ У ДЗЕСЯЦІДВОРКАХ. АСАБЛІВА ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ ЭНЭРГІЧНУЮ РАБОТУ ЧЛЕНА СЕЛЬСАВЕТУ Т. АЎСЯНКОВА І УПАЎНАВАЖАНАГА СЯЦІДВОРКАХ Т. КРЫШНЁВА.

ЯНЫ ШТОДЗЕННА РАСТЛУМАЧАЛІ ПРАЦОЎНЫМ АДНААСОБНІКАМ НЕДАЦЭНАСЬЦЬ ПЕРШАЧАЛЬНЫХ АДНААСОБНІКАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

І НЯ ТОЛЬКІ РАСТЛУМАЧВАЛІ, АЛЕ І ПАКАЗВАЛІ АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДАМ, ЯК ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТЫ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

Т. Т. АЎСЯНКОЎ І КРЫШНЁЎ ПЕРШЫМІ Ў ВЁСЦЫ РАЗЬЛІЧЫЛІСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ ПА ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ.

ЎЗМАЦНЯЮЦЬ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ

СЯННО, 28. (Па тэлеграфу).

Жнівеньскі плян здачы ільнасемя дзяржаве ПЕРАВЫКАНАН у пяць раз. Замест 18 тон, здана 90.

***

БЕШАНКОВІЧЫ, 30.

Калгас «Асьвета» поўнасьцю здаў дзяржаве ільнатрасту. Згодна кантрактацыйнага дагавору, дзяржаве здана 36 цэнтнэраў высокакласнай трасты.

***

ВУШАЧЫ, 30 (Белта).

У раёне разгарнулася здача ільнатрасты повага ўраджаю. Першым здаўавыш тоны высокакласнай трасты калгас «Піянэр». Калгас «Першамайскі гарадок» здаў тры тоны.

102 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПЛЯНУ

ГОМЕЛЬ, 30. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ВЫКАНАН ДА 28 ЖНІЎНЯ НА 102 ПРОЦ.

ШАФАРЭНКА, РАЧЫЦКІ.

РЭАЛІЗУЕМ ПАСТАНОВУ ЦК І СНК

АБ ДАПАМОЗЕ БЕСКАРОЎНЫМ

УДАРНІКАМ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

РЭЧЫЦА, 11.

Калгасьнікі с.-г. арцелі «ЛАНДАРБАЙТ», Дамніхоўскага сельсавету з вялікім энтузіязмам сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным.

Калгасьнікі ўхвалілі практычныя меры па рэалізацыі пастановы СНК і ЦК. У першую чаргу атрымліваюць цёлкі 19 лепшых калгасьнікаў-ударнікаў.

У НАС НЯ БУДЗЕ БЕСКАРОЎНЫХ

ПОЛАЦАК, 1.

У раёне разгортваецца масавая праверка пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным калгасьнікам у шабашыцкі раёў.

У адказ на пастанову СНК і ЦК вытворчыя брыгады калгасу «Чырвоны араты» заключылі паміж сабой сацыялістычныя дагаворы на хутчэйшае і лепшае завяршэньне ўборкі, паставак збожжа і сяўбы азімых.

У калгасе адбыўся масавы сход, прысьвечаны праверцэўцы пастановы СНК і ЦК аб дапамозе бескароўным. Калгасьнікі заявілі, што ў іх калгасе ня будзе бескароўных, настанавіўшы выдаць цёлак у першую чаргу лепшым ударнікам калгасу т. т. Карповіч і Мардзёнку, былым беднякам. **(БЕЛТА).**

ТРЫ НОВЫХ МТС

У верасьні ў БССР арганізуецца тры новых машына-трактарных станцый. Дзьве МТС—Глуская і Пятрыкоўская ўваходзяць ў сыстэму Збожжатрактарацэнтру, трэцяя — Быхаўская — у сыстэму Бульбатрактарацэнтру.

РАЗАМ З НОВЫМІ МТС У БССР БУДЗЕ 63 МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ З ПАРКАМ У 1.681 ТРАКТАР.

У верасьні БССР атрымае з Чэлябінскага заводу пяць 60-сільных гусеничных трактараў «Сталінец». «Сталінцы» будуць скарыстаны на пад'ёме цаліны і распрацоўкі новых зямель.

Два «Сталінцы» будуць накіраваны ў Гарадоцкую МТС і па адным у Пялоўскую, Сіроцінскую і Попадзькую.

Апроч таго ў верасьні для МТС БССР завозіцца 100 трактараў маркі «ХТЗ» і «СТЗ». (Белта).

РАЗГРАМІЦЬ АНТЫМЭХАНІЗАТАРАЎ,

ПОЎНАСЬЦЮ СКАРЫСТАЦЬ КОЖНУЮ ІЛЬНАЦЕРАБІЛКУ

Наша партыя атрымала буйнейшыя перамогі на шляху мэханізацыі сацыялістычнага ільнаводзтва.

У кожным асноўным ільнаводным раёне працуе машына-трактарная станцыя, якая ўзбройвае калгасы перадавой с.-г. тэхнікай. У распараджэньне МТС краіна прадаставіла сотні навейшых ільнаўборачных машын—«камсамолак», якія даюць магчымасьць крута ўзьняць і тэмпы і якасьць ільнаўборкі.

Задача заключаецца ў тым, каб правільна выкарыстаць кожную машыну, каб берагчы яе, як зяніцу вока.

Вось гэтай элементарнай ісьціны, гэтай кроўнай задачы яшчэ не зразумелі многія кіраўнікі ільнаводных раёнаў і ільнаводных МТС.

Антымэханізатарскія настроі, а яны навеяны кулаком, яшчэ ня зломлены і даюць сябе рэзка адчуваць.

Чыю выгаду адлюстроўвае лягенда аб «нэрэнтабельнасьці» ільнацерабілак? Адказ можа быць толькі адзін: недабітага кулака, нявыкрытага буржуазнага шкодніка, пацэма-прыпічэпаўца.

Гэта яны пусьцілі ў ход лягенду аб «самабытнай беларускай зямельцы, на якой машыны ня пойдуць». Гэта яны, асколкі нацэмаўска-прыпічэпаўскай зграі, пралезшы ў зямельныя органы зрывалі мэханізацыю сельскай гаспадаркі, азмярцьвялі машынны парк МТС.

Вораг разгромлен, але ён яшчэ не дабіт. Антымэханізатарскія настроі—рэцыдыў шкодніцкай лягенды аб «нэрэнтабельнасьці» ільнацерабілак, яшчэ жывуць.

Паслухайце пра факты. Возьмем **СУРАЖ.** 66 ільнацерабілак. Гэта — магутная сіла, якая дазваляе раёну пры правільным спалучэньні мэханізаванай і ручной ільнаўборкі значна лепш і значна хутчэй убраць ураджай.

Колькі-ж працуе машын? Фактычна ні адна. Машыны стаяць, мясцовыя работнікі ў адзін голас крычаць, што з машынамі «толькі гора». А кулак злосна расказвае гэты агідны паклёп на ільнацерабілку.

У чым-жа справа? У машынах?

НЕ, ТЫСЯЧУ РАЗ НЕ!

Як можа працаваць ільнацерабілка, калі яе давяраюць кулаком—шкодзікам, якія адкрыта лсуюць машыны (гл. матар'ялы аб Сураскай МТС у сёнешнім нумары «Зьвязды» і ў «Зьвязьдзе» ад 30 жніўня).

Але тут—у Суражы—мы маем справу з адкрытай вылазкай абнаглеўшага кулака, які зьнішчае машыны, кідае іх на поле, раскрадвае дэталі і часткі.

Звычайна вораг выступае не адкрыта, а ціхай сапай, маскуючы сваё шкодніцтва. У Лёзьнянскім, Вушацкім і іншых ільнаводных раёнах можна знайсьці даволі красамоўных ілюстрацый.

Ільнацерабілку вывозяць на ільняныя масывы ніпаўмысьля без неабходных дэталяй і частак, каб машына адразу стала.

Ільнацерабілкам адводзяць самыя горшыя вучасткі з самым нізкім прылегшым да зямлі ільном, каб потым са злосьцю крычаць, што «ільнацерабілка

УЗЬНІМАЕЦЦА АВАНГАРДНАЯ РОЛЯ КАМУНІСТАЎ

(Артыкул нам. начпалітаддзелу Аршанскай МТС тав. А. Герцовіча)

Папярэднія вынікі перабудовы партыйнай работы ў калгасах Аршанскай МТС паказваюць, наколькі вялікае палітычнае значэньне адыграла гэтая справа ў барацьбе за вырашэньне нашай асноўнай задачы—зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Практычная работа, праведзеная Аршанскім паліткаддзелам у гэтым напрамку, цьвілася магутным вагаром у барацьбе за сацыялістычнае пярэшнства ў арганізацыі і правядзеньні ўборачнай кампаніі, у барацьбе за датэрміновае выкананьне калгасамі абавязацельстваў перад дзяржавай. Праведзеная рэарганізацыя партыйнай структуры, расстаноўка партыйных сіл у поўнай адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) значна наблізіла партыйныя ячэйкі і камуністаў да калгаснай вытворчасьці, дала магчымасьць канкрэтызаваць партыйнае кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю, узьняла адказнасьць ячэек і асабовых камуністаў за работу калгасаў і іх нізавых вытворчых аддзеньняў. Праведзеная рэарганізацыя зьвялася рашаючай прадпасылкай заваяваньня калгасамі зоны МТС пярэшнства ў раёне па сенажоўбоцы і насыпяховага разгортваньня падрыхтоўкі і правядзеньня ўборкі ўраджаю і збожжапаставак.

Калі да перабудовы партыйнай работы ў сельсаветах і калгасах зоны МТС мы ня мелі ні адной вытворчай калгаснай ячэйкі, то ў рэзультаце праведзенай перабудовы мы маем дзьве калгасныя вытворчыя ячэйкі, адну кандыдацкую групу і 14 партыйна-камсамольскіх ядраў. Апрача таго, у 48 калгасах ёсьць партарганізатары, прычым у 14 калгасах партарганізатары працуюць непасрэдна ля калгаснай вытворчасьці, а ў астатніх — прымацаваны камуністы з ліку гарадзкога партактыву ці з тэрытарыяльных ячэек.

Значная колькасьць нова-створаных намі нізавых партыйных зьвеньняў за параўнаўча кароткі час паказалі сябе вусім жыцьцёвымі, далі ўзор бальшавіцкай барацьбы за вырашэньне пастаўленых перад імі партыяй задач. Дамо слова фактам.

Ячэйка калгасу **«Рабочая культура»** была арганізавана ў той час, калі гэты калгас знаходзіцца ў глыбокім тыле. Тады ў «Рабочай культуры» адсутнічала правільная арганізацыя працы, мела месца засьмечанасьць кулацкімі элементамі, сярод калгаснікаў панавалі недысцыплінаванасьць і расхлябанасьць.

Пасьля таго, як у гэтым калгасе была арганізавана парт'ячэйка, у яго рабоце можна было заўважыць значны пералом. Калгас адным з першых закончыў сенаўборку і першым здаў добраякаснае сена дзяржаве. Уборка азімых у «Рабочай культуры» закончана да 12 жніўня, а 12-га — завершана здача гадавога пляну па жыце, ячмені і натуральнай аплаце за работу МТС.

Посьпехі ў рабоце гэтага калгасу перш за ўсё тлумачацца тым, што партыйная ячэйка калгасу правяла вялікую работу па самаачыстцы ад кляса-варожых элементаў, надаючай вялікую ўвагу аддала пытаньням арганізацыі працы і разгортваньню масава-выхаваўчай работы. Значная колькасьць калгаснікаў ахоплены сацпаборніцтвам, паміж брыгадамі і зьвеньнямі заключаны сацдагаворы, выкананьне якіх рэгулярна правяраецца. Вынікі работы брыгад заўсёды можна бачыць на чырвонай і чорнай дошцы. Ёсьць у калгасе і пераходныя брыгадны чырвоныя і рагожны сьцяжкі. Ды дзень пасьля работы ў брыгадзе праводзіцца кароткая вытворчая [illegible] на якіх падагульваюцца выніковых работ. Карыстаючыся мамі гэтых вытворчых нарад, праўленьне калгасу разам з брыгадзірамі [illegible] ае, якой брыгадзе перадаць чырвоны ці якой — рагожны [illegible]

[illegible] ужо добрыя вынікі [illegible] ае особых партарганізацый. [illegible] паладзіў работу з калгасным актывам партарганізатар калгасу **«Чырвоная Хаўкіна»** тав. **Герман**. Ён сыстэматычна праводзіць з актывам нарады, выкарыстоўваючы перапынкі і адпачынак у часе работы непасрэдна на полі; прапрацаваў з калгаснікамі ў брыгадах пастановы пленуму ЦК, пастановы ЦК і СНК аб разьмеркаваньні калгасных даходаў і стварэньні фондаў. Па яго ініцыятыве ў калгасе было арганізавана спаборніцтва па арганізацыі непарушанасьці вытворчых працэсаў, пачынаючы са жніва і канчаючы збожжапастаўкай.

Аналёгічныя прыклады добрай работы можна прывесьці з калгасу **«Новыя Гарбацэвічы»** (парторг **Чамярочка**) і інш.

Аднак, усе гэтыя факты не даюць нам права лічыць, што перабудова партыйнай работы ўжо закончана. Ёсьць яшчэ нямала выпадкаў, калі паасобныя камуністы не разумеюць сутнасьці гэтай перабудовы. Сярод іх ёсьць члены партыі, якія маюць немалы вопыт партыйнай работы на вёсцы, але яшчэ ніяк ня могуць адвыкнуць ад старых метадаў работы. Яны ўсё яшчэ імкнуцца зьвесьці партыйна-масавую работу да сходаў, пісаньня доўгіх рэзалюцый і г. д. Напрыклад, былы сакратар Кудаеўскай тэрытарыяльнай парт'ячэйкі Касьянаў пасьля ня рэарганізацыі быў вылучан парторгам у калгас «Х зьезд саветаў». Аднак, адвыкнуць ад ролі кіраўніка «наогул» ён спачатку ня змог. Нават тады, калі ўжо ня існавала ячэйкі, а ўсе камуністы былі прымацаваны да асобных калгасаў, Касьянаў па-ранейшаму склікаў сходы «ячэйкі», заслухоўваў даклады партпрымацаваных, даваў ім дырэктывы і г. д., а сваёй непасрэднай работай, як партарганізатар калгасу, ня лічыў патрэбным займацца.

Такі-ж факт меў месца і ў Веравайшанскім сельсавеце.

Найбольшыя цяжкасьці сустракаліся ў тых калгасах, дзе павінны былі працаваць у якасьці партарганізатараў прымацаваныя з раёну, ня зьвязаныя непасрэдна з калгаснай вытворчасьцю камуністы. Па-першае, тут мы маем ня зусім сур'ёзныя адносіны райкому да вылучэньня партарганізатараў. Сярод вылучаных знайшлі месца людзі, якіх праз пару дзён пасьля прымацаваньня камісіі па чыстцы выключылі з партыі (Кац, Пашкевіч і інш.).

Рад прымацаваных аказаліся настолькі «загружанымі» (Далінёнка і інш.), што райком партыі пачаў іх адклікаць, а на месца іх прысылаў новых людзей, што, па сутнасьці, перашкаджала перабудове партыйнай работы. Трэба сказаць, што ў ліку прымацаваных ёсьць і такія камуністы, якія не зразумелі, або ня хочуць зразумець сутнасьці ўскладзеных на іх задач (**Зайцаў**, калгас «Другая пяцігодка»; **Фамін** — «Барацьбіт» і інш.). Гэтыя таварышы наведваюць калгасы, але ніяк ня хочуць апусьціцца ў калгасныя нізы, у брыгады, зьвеньні і арганізаваць там як належыць работу, дапамагчы ім. Тав. Фамін, які раней працаваў у сельсавеце ўпаўнаважаным РК і РВК, і зараз яшчэ карыстаецца старымі метадамі работы. Ён менш за ўсё цікавіцца работай свайго калгасу, менш за ўсё аддае ўвагі рабоце брыгад і зьвеньняў, а больш за ўсё ходзіць па сельсавеце, ад калгасу да калгасу і... ін структуце мясцовых работнікаў.

Паштрымаваныя такога тыпу звычайна прыходзяць у калгас для таго, каб пасядзець у праўленьні, сабраць розныя весткі, адным словам, перашкаджаць рабоце кіруючым калгасным работнікам.

Усё гэта ставіць перад паліткаддзелам задачу зараз-жа зьвярнуць асаблівую ўвагу на зьмест работы нізавых зьвеньняў партарганізацый, на выкараненьне элементаў фармалізму, калі перабудова партыйнай работы зводзіцца да простай перастаноўкі людзей.

У мэтах зьнішчэньня гэтых недахопаў мы паставілі перад сабой задачу — **КІРАВАЦЬ НІЗАВЫМІ ПАРТЫЙНЫМІ ЗЬВЕНЬНЯМІ НА АСНОВЕ НЕПАСРЭДНАГА ПАКАЗУ РАБОТЫ, ЖЫВОГА ІНСТРУКТАЖУ І ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ ячэйцы і партарганізатарам у калгасах.**

Усе работнікі паліткаддзелу прымацаваны да пэўных кустоў калгасаў МТС, вывучаюць іх, інструктуюць кіруючых і партыйных работнікаў. **У аснову ўсёй работы паліткаддзелу пакладзен прынцып — працаваць непасрэдна ў нізох,** прыходзіць у калгас не на адну гадзіну, а прабыць у ім такі час, каб можна было ня толькі добра азнаёміцца, але аказаць яму патрэбную дапамогу: окласьці ілян работы, пайсьці з парторгам у брыгаду і правесьці там тое ці іншае мерапрыемства.

Мы адмовіліся ад такога мэтаду кіраўніцтва, як скліканьне ў раён партарганізатараў, бо гэта адрывае іх ад сваёй непасрэднай работы. У мэтах-жа папулярызацыі каштоўнага вопыту, мы вызначаем у зоне МТС пэўныя кусты калгасаў, вылучаем сярод іх апорны пункт — калгас, жыцьцё і работа якога арганізаваны добра, вывучаем яе і склікаем у гэты калгас партарганізатараў з бліжэйшых пунктаў.

Першы вопыт перабудовы партыйнай работы, дасягнутыя намі ў гэтым напрамку рэзультаты як ня трэба лепш пацьвярджаюць правільнасьць і неабходнасьць пастановы ЦК аб рабоце паліткаддзелаў і перабудове партыйнай работы. Толькі на аснове неадкладнага ажыцьцяўленьня гэтага рашэньня мы зможам у самы кароткі тэрмін узьняць авангардную ролю камуністаў у калгаснай вытворчасьці, дабіцца бальшавіцкай работы калгасаў.

АБ ДЫРЭКТАРОХ ТОРФЗАВОДУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ І ІМЯ ДАЎМАНА

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прызнае, што дырэкцыі торфзаводаў «Савецкая Беларусь» і імя Даўмана, ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні ЦК аб фарсаваньні торфаздабычы, правялі злачынную бязгаспадарчасьць у справе перабудовы работы торфзаводаў, арганізаванага набору рабочай сілы, скарыстаньня механізмаў, прывялі заводы да прарыву ў выкананьні прамфінпляну і паставілі пад пагрозу зрыву ўборку і сушку выпрацаванага торфу.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Дырэктароў заводаў «Савецкая Беларусь»—т. **Гальперына** і імя Даўмана—т. **Белавусава** за зрыў выкананьня пляну здабычы торфу, як апартуністаў, з работы дырэктароў зьняць.

2. Справу аб іх партыйнасьці перадаць на разгляд ЦКК.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Аб рабоце лёгкай прамысловасьці БССР

(З пастановы калегіі НКЛП СССР)

МАСКВА, 31-VIII (БЕЛТА).

У рэзультаце непасрэднага азнаямленьня Наркамлёгпраму тав. Любімага з работай беларускіх прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці, Калегія Наркамлёгпраму СССР прыняла спэцыяльную пастанову. У гэтай пастанове падкрэсьліваецца, што адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал швэйнай, трыкатажнай і скурабутковай прамысловасьці Беларусі дрэнна змагаецца за выкананьне якасных і кольскасных паказальнікаў пляну. Асабліва адзначаецца дрэнная якасьць прадукцыі Віцебскай швэйнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», трыкатажнай фабрыкі «КІМ», Віцебскай абутковай фабрыкі.

Наркамлёгпрам пастанавіў зьняць пам. загадчыка закройным цэхам фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» **Мельцына**, які ня справіўся з работай, і абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем загадчыку цэху **Катышову**, інструктару цэху **Хейфецу**, майстру піджачнага цэху **Астраўлянскаму**, інструктарам піджачнага цэху **Герману, Шляпакову, Сінаповічу** і **Кацаву**, інструктарам бручнага цэху **Дольнікаву, Рахільніку, Кагану**. Дырэктару сумесна з партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі прапанавана прыняць рашучыя меры да паляпшэньня работы фабрыкі і ўжываць самыя суровыя спагнаньні да тых, хто парушае працоўную дысцыпліну, пасьўна адносіцца да барацьбы за выкананьне пляну і паляпшэньне якасьці прадукцыі. Начальніку галоўнага швэйнага кіраўніцтва СССР **Кубланаву** прапанавана ўзяць работу фабрыкі пад асабісты нагляд.

На трыкатажнай фабрыцы **«КІМ»** Наркамлёгпрам паставіў на від дырэктару **Фрэйдзіну** за нездавальняючае кіраўніцтва асваеньнем абсталяваньня і абвясьціў суровую вымову тэхнікіраўніку фабрыкі **Рабчуку** і загадчыку вязальнага цэху **Хайкіну** за забруджваньне тавараў масьлянымі плямамі. Галоўнаму кіраўніцтву трыкатажнай прамысловасьці СССР і Наркамлёгпраму Беларусі даручана аказаць фабрыцы дапамогу ў асваеньні абсталяваньня. Пастаноўлена таксама накіраваць на «КІМ» чатырох ІТР, двух майстраў, закройшчыка і інструктара з трыкатажных прадпрыемстваў.

Па Віцебскай абутковай фабрыцы прапанавана зьняць з работы тэхнікіраўніка і абвясьціць вымову дырэктару фабрыкі **Хайкіну** за дрэнную якасьць прадукцыі.

Дырэктару Менскай абутковай фабрыкі **Шэрману** пастаўлена на від, невыстарчальная барацьба за павышэньне якасьці прадукцыі.

Наркамлёгпрам папярэдзіў дырэктароў і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал астатніх беларускіх прадпрыемстваў, што калі ў найкарацейшы тэрмін ня будуць зьмыты недахопы, адзначаныя Любімым пры наведваньні гэтых прадпрыемстваў, дык вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасьці.

АБ ЗЬМЕНАХ У СКЛАДЗЕ ЯЧЭЙКОВЫХ КАМІСІЙ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

Пастанова Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы менскай партыйнай арганізацыі

Унесьці наступныя зьмены ў склад ячэйковых камісій па чыстцы партыі:

а) **По групе металёвай прамысловасьці:** У сувязі з назначэньнем тав. **Харлапа Л. С.** старшынёй камісіі па чыстцы навучальных устаноў, членам камісіі замест т. Харлапа назначыць тав. **Любіча Ф. К.**, член партыі з 1924 г., рабочы, майстар вагоннага дэпо МБВ чыг.

б) **По групе ячэек саматужнай прамысловасьці:** У сувязі з адкліканьнем тав. **Альгінскай С. Д.** па непасрэднай рабоце, членам камісіі замест тав. Альгінскай назначыць тав. **Гарэгляд С. У.**, член партыі з 1921 г., работніца-прыёмшчыца швэйнай фабрыкі імя Крупская.

в) **По групе транспортных ячэек:** У сувязі з тым, што члены камісіі т. т. **Зоўлаў І Мельнікаў** назначаны старшынямі ячэйковых камісій, замест іх членамі камісіі назначыць т. т. **Дарашэвіч К. М.**, член партыі з 1919 г., служачы, ушчуваважаны апар. аддзелу ГК РСМ і **Пітліну П. С.**, член партыі з 1925 г. работніца, старшы інспэктар індывідуальнага падпіску ф-кі «8-гэ сакавіка».

г) **По групе ячэек харчовай прамысловасьці:** Замест выбыўшага члена камісіі т. **Адлерштэйна**, членам камісіі назначыць тав. **Канэра Н. Б.**, член партыі з 1924 г., рабочы, майстар зав. «Беларусь».

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ.

Аб складзе ячэйковых камісій па чыстцы партыі

ПАСТАНОВА ГАРАДЗКОЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Назначыць ячэйковыя камісіі па чыстцы Менскай партарганізацыі ў наступным складзе:

СТАРШЫНЯ — ПІЛІПЁНАК В. А., член партыі з 1924 г., рабочы, старшыня ЦП саюзу машынабудаўніцтва. **ЧЛЕНЫ—КІРЭНЭР Э. К.**, член партыі з 1926 г., рабочы, член МенгарКК КП(б)Б, нам. загадчыка ЗРК зав. «Бальшавік»; **ГРЫБ Р. В.**, член партыі з 1920 г., селянін, інспэктар паліткаддзелу ГК РСМ.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: Абутковая фабрыка, абутковая майстэрня, абутковы скуртрэст, Саюзскур, Наркампёгпрам.

СТАРШЫНЯ — МЕЛЬНІКАЎ М. П., член партыі з 1918 г., рабочы, старшыня ЦП саюзу жывёлагадоўчых саўгасаў. **ЧЛЕНЫ: ГАРАЎСКІ А. Ф.**, член партыі з 1917 г., рабочы, праваднік вагоннага дэпо МБВ-чыг.; **ПЕРАВОЗКІН Г. М.**, член партыі з 1921 г., служачы, інспэктар ГК РСМ.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: Наркамснаб, Белрыба, Плодагародтрэст, Саюзмаслапрам, Белгандаль, Менгандаль, Белдзяржснаб, Белсельгаснаб, Загатлён, Загатжывёла, Загатзерне, Мензагатзерне, Белмалпрамтрэст, Камітэт загатовак.

СТАРШЫНЯ — ХАРЛАП Л. С., член партыі з 1921 г., селянін, дэкан санфака мэдінстытуту. **ЧЛЕНЫ: НЕСЬЦЕРАЎ В. Я.**, член партыі з 1925 г., рабочы, нам. нач. пажарнай аховы; **ЗЛЬКІНД**, член партыі з 1924 г., рабочы, токар-шліфоўшчык зав. імя Варашылава.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: ВКСГШБ, КІЖ, БДУ.

СТАРШЫНЯ — ЛЕВІН М. У., член партыі з 1918 г., служачы, дырэктар Белкамунснабу. **ЧЛЕНЫ: ПАЎЛОВІЧ І. М.**, член партыі з 1924 г., рабочы, інструктар ФЗУ МБВ-чыг.; **КАВАЛЕВІЧ І. В.**, член партыі з 1919 г., селянін, нач. камаддзелу ГК РСМ.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: завод «Ударнік», зав. ланцугоў «Гальля», ВЭА, фізкультэтэхнікум, Дзяржбібліятэка.

СТАРШЫНЯ — ЗАВ'ЯЛАЎ С. М. — член партыі з 1919 г., рабочы, дырэктар заводу малочных кіслот. **ЧЛЕНЫ: ЛЯХОВІЧ**, член партыі з 1919 г., служачы, старшы інспэктар ГК РСМ; **РОЗІН С. П.**, член партыі з 1919 г., служачы, асьпірант істпарту.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: Наргасвучот, Гарсавет, спраўдом, ашчадкаса, інстытут права, плянава-эканамічны інстытут, хіміка-тэхналёг. інстытут.

СТАРШЫНЯ — ІОФФЭ З. Х., член партыі з 1919 г., рабочы, адсакр. арт. палка. **ЧЛЕНЫ: СЯРГЕЕЎ В. Н.**, член партыі з 1924 г., рабочы-слесар зав. «Камунар»; **МІХАЛЮК Ф. С.**, член партыі з 1917 г., служачы, інспэктар УПО АДПУ.

ПРАВОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ Ў ЯЧЭЙКАХ: Наркамгас, Менкамгас, лазьняпральны трэст, пажарная каманда, трэст гасьцінніц, водаканалтрэст, Белкамунбуд, Менбуд, зав. стандартных дамоў, Белбудматар'ялы, будканторэ, Менкамгас, Белжылсаюз і Менгаржылсаюз.

Аб ходзе выкананьня пляну таваразвароту і аб фактах скажэньня гандлю на вёсцы

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК канстатуе, што ў справе выкананьня пастановы ЦК і СНК БССР ад 8 жніўня аб гандлі, перапому няма. Цэнтры гандлюючых арганізацый (БЕЛКААПСАЮЗ, БЕЛГАНДАЛЬ) па-ранейшаму кіруюць гандлем і нізоўкай канцылярска-бюракратычнымі мэтадамі.

Рад райкомаў і РВК яўна недаацэньваюць важнасьці задачы гандлю; работа гандлюючых арганізацый раённымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі ня была ўзята пад стражэйшы апэрацыйны кантроль і кіраўніцтва.

Ва многіх раёнах сельспажытаварыствы знаходзяцца пад замком, у радзе выпадкаў маюць месца грубыя скажэньні мэтадаў гандлю.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За зрыў гандлю на вёсцы:

а) старшыню **ЛАГОЙСКАГА** спажыўсаюзу тав. **РАДАЕВА** з работы зьняць і аддаць пад суд;

б) прыцягнуць таксама да судовай адказнасьці б. старшыню **КАРАЎЛЯНСКАГА** райспажыўсаюзу **ШЫЛОВІЧА**, зьнятага з работы Нараўлянскім РК;

в) прасіць ЦККК у тэрміновым парадку вырашыць пытаньне аб іх партыйнасьці.

2. Прапанаваць пракурору рэспублікі тав. **КУЗЬМІНУ** тэрмінова расьследаваць факты спэкуляцыі запалкамі і солью (тавараабмен, прымусовы асартымэнт пры продажы) з боку сельспажытаварыстваў і крам Белгандлю ў **ЛЁЗЬНЯНСКІМ І ШКЛОЎСКІМ** раёнах і прыцягнуць вінаватых да суровейшай крымінальнай адказнасьці.

3. Палярэдзіць т. т. **ЦАРОНКА, ВЕРБУ, СЯМЁНАВА** і кіраўнікоў баз прамысловасьці, што калі ў бліжэйшыя дні імі на справе ня будзе зломлен саботаж у разгортваньні гандлю і працоўваньні тавараў на вёску і ня будуць прыняты апэрацыйныя меры да умацаваньня нізоўкі і выкараненьня фактаў спэкуляцыйна-нэпманскіх скажэньняў прынцыпаў савецкага гандлю (тавараабмен, прымусовы асартымэнт, узьвін чваньне цэн), яны будуць прыцягнуты да суровейшай партыйнай адказнасьці.

4. ЦК КП(б)Б прапануе сакратаром ГК і РК ліквідаваць у практыцы работы мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый факты актыпартыйных пагардлівых адносін да пытаньняў гандлю і работы сельспажытаварыстваў.

ЦК лічыць простаю задачай ГК РК:

а) сыстэматычную праверку наяўнасьці тавараў у крамах і на складзе;

б) прыняцьце апэрацыйных мер да пашырэньня асартымэнту тавараў у кожнай краме, правільнага іх скарыстаньня;

в) пастаянныя клопаты аб гаспадарча-арганізацыйным умацаваньні сельспажытаварыстваў.

5. ЦК канстатуе, што, ня гледзячы на рад пастаноў і тэлеграм ЦК аб забароне мабілізацыі кваліфікаваных гандлёвых работнікаў на розныя кампаніі, ня зьвяжаных з іх непасрэднай работай на гандлі — рад раёнаў па-ранейшаму ігнаруюць гэтыя дырэктывы ЦК, пакідаючы часамі райсаюзы, райзагі, міжрайбазы і сельспажытаварыствы абсалютна без усякага кіраўніцтва.

ЦК яшчэ раз катэгарычна забараняе ўсялякую мабілізацыю на розныя кампаніі работнікаў кааперацыйнай і гандлёвай сыстэмы, прапануе неадкладна вярнуць усіх мабілізаваных працаўнікоў і папярэджвае ўсіх сакратароў райкомаў, што пры выяўленьні фактаў ігнараваньня гэтай пастановы яны будуць несьці стражэйшую пэрсанальную адказнасьць, аж да пастановы пытаньня аб іх партыйнасьці.

6. Для прыняцьця апэрацыйных мер па ўзмацненьні гандлю намандыраваць на 5-7 дзён: у Магілеў - Чавусы — т. **МАТУСЕВІЧА**, Бабруйск — т. **МЫШАЛАВА**, Ворша — Мсьціслаўе—тав. **ВАЙСМАНА**, Дуброўну—т. **ЛЕВІТА**, Гомель—т. **СЯМЁНАВА**, Калінковічы—Нароўлю—т. **ДРАПІЛЕВА**, Віцебск—тав. **ВЕРБУ**, Дрысу—Полацак—т. **ФЭЛЬДМАНА**, Чэрвень—т. **РОЗЭНГАУЗА, КЛІЧАЎ**—т. **САКАЛІНСКАГА**, Парычы тав. **ТАУКАЧОВА**, Лагойск—т. **КУДРАЕВА**, Сянно т. **КАГАНА** (ЦП СКІП), Сураж—т. **ГАУРАСЕВА** (Усякабанк).

МЮД У БССР

БАЯВЫ АГЛЯД

МЕНСК.

Па сьвятошнаму ўпрыгожан горад. Сьцягі, пёўнгі, транспаранты. Яркімі электрычнымі агнямі пераліваюцца вялізарныя сьцяжкі КІМ'у. 19 МЮД завае ваў Менск.

Ленінскі камсамол, працоўная моладзь дэманструе ў гэты дзень сваю адданасьць сацыялізму, сваю гатоўнасьць заўсёды быць дастойным сынам, верным памочнікам партыі, з маладым запалам змагацца пад сьцягам пралетарскага інтэрнацыяналізму.

У гітлераўскай Германіі рэвалюцыйную моладзь гноець у канцлягерах і турмах. У гаміндананаўскім Кітаі рубяць галовы за прыналежнасьць да гераічнага камсамолу. У фашысцкай Польшчы камсамольцаў катуюць у засьценках і канцэнтратах.

Тольки ў СССР, у краіне Саветаў, працоўная моладзь акружана любоўю, увагай і клопатамі. На сацыялістычных палёх, на індустрыяльных гігантах, на школьных лавах ленінскі камсамол выкоўвае новага чалавека — актыўнага будаўніка сацыялізму.

***

Тольки скончыўся рабочы дзень, тольки заводзкія гудкі далі «адбой», як са ўсіх фабрычных брам стройнымі калёнамі рушыліся атрады рабочай моладзі. Наперакор шэраму асеньня-сумнаму дню, наперакор пёўню, бязьлітасна хлынуўшаму на горад, буйнай, мападой, бадзёрай радасьцю запаліся вулі-цы.

Шэсьць з паловай гадзін. На пляцу Волі выстрайваецца атрад фанфарыстаў. Угару ўзьлятаюць ярка-срэбныя трубы. Рэзкія гукі ўрачыстага маршу абвяшчаюць аб пачатку дэманстрацыі. На трыбуне: — т. т. Гікало, Шаранговіч, Рыскін, Жаброўскі, Картукоў, Занкоўскі, Герцовіч, Аранштэм, Бэнэк, Хецкевіч, Чарнушэвіч, Кудзелька і інш.

Горача вітаюць іх калёны юных дэманстрантаў. Першай бадзёрым чаканным крокам уваходзіць на пляц калёна сьцяганосцаў. Дзесяткі чырвоных штандараў. Іх нясуць лепшыя маладыя ўдар нікі заводаў, змагары за прамфінплян, за асваеньне новай тэхнікі.

За імі—чырвонасьцяжны завод імя Варашылава. Упераздзе машына з двума новымі бліскучымі, толькі што адліцанца вазьмі варштатамі — падарунак мападых рабочых 19-му МЮД'у. Бурныя крыкі «ура» перакатваюцца з калёны ў калёну. Працоўная моладзь з энтузіязмам падхапляе пёзунгі трыбуны.

— «Няхай жыве ЦК УсеКП(б) і яго правадыр т. Сталін»!

— «Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з лепшым бальшавікам т. Гікало»!

— «Ленінскі Камсамол, штурмуй вышыні перадавой тэхнікі!»

Баявая пераклічка 19-га МЮД. Завод за заводам праходзяць міма трыбуны. Ідуць і сотні старых рабочых—яны разам з моладзьдзю сьвяткуюць міжнародны юнацкі дзень.

Па калёнах нясуцца магутныя гукі «Інтэрнацыяналу». Іх падхапляе трыбуна. Іх паўтараюць шматлікія аркестры. Тысячы сьпяваюць міжнародны пралетарскі гімн.

Кожная калёна нясе мастацкі-аформленыя плякаты і макеты.

Гераічны кітайскі камсамол са зброяй у руках абараняе Саветы.

Зьвярыная постаць штурмавіка, наступаючага на рабочую моладзь Германіі. Германскі камсамол ва ўмовах подпольнай барацьбы арганізуе моладзь на новыя баі.

Нясуць высокія капасы — наглядныя паказальнікі бальшавіцкага ўраджаю. Тут-жа ільнацерабілкі — падшэфныя камсамолу, машыны, што заваёўваюць перамогу на палёх.

Ударнікі заводу імя Молатава нясуць на плячох невялікую домну з кароткім сымвалічным надпісам «Крах II-га Інтэрнацыянала».

Новыя і новыя калёны ўліваюцца на плошчу. Прашлі заводы. Дэманструюць школы. Яны сёньня імяніны. Міжнародны юнацкі дзень сышоўся з пачаткам заняткаў. Іх пёзунгі заклікаюць палепшыць якасьць вучобы, па-ўдарнему арганізаваць работу школ.

А ў паветры павольна плывуць шары «Мантгольф'ера», пушчаныя тут-жа на пляцу. Яны — жывы заклік да аўпаданьня паветрам, да новых перамог у авалоданьні тэхнікі.

Прайшлі апошнія атрады. З вінтоўкамі на перавес прамаршыравалі калёны чырвонаармейскай моладзі. Агляд баявых сіл скончан. Трыццаць тысяч мападых рабочых дэманстравалі 1-га верасьня па вуліцах Менску. Б—ў.

***

ГОМЕЛЬ, 2. (Нашэ спец. кар.).

Сьвяткаваньне міжнароднага юнацкага дня прайшло пад знакам мабілізацыі камсамолу і ўсёй працоўнай моладзі на далейшую барацьбу за ажыцьцяўленьне чартовых гаспадарча-палітычных задач.

Многія ячэйкі камсамольскай арганізацыі Гомельшчыны адзначылі XIX МЮД новымі вытворчымі перамогамі. Камсамольцы зборачнага цэху заводу імя Кагановіча забясьпечылі выпуск звыш пляну двух сіпасарэзак, аднэй слячкарні і аднэй бульбакапалкі. На заводзе імя Ланцучкага камсамольская брыгада Сулёвонскага выпусьціла звыш пляну адзін вагон. Гаспадарча-разрахунковая моладзьная брыгада Арлоўскага дала звыш пляну 160 шківаў і 120 гаек. Камсамольцы ступеньчатага дэпо выпусьцілі звыш пляну з халоднай прамыўкі адзін паравоз.

На камбінаце «Спартак», пклобудзе, заводзе «Пралетары», «Чырвоны хімік» і фабрыцы «Камінтэрн» арганізаваны новыя моладзьныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады імя XIX МЮД'у.

Па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі перадавога ў раёне калгасу «Інтэрнацыянал» у гонар рэвалюцыйнага сьвята моладзі арганізаваны чырвоныя абозы са збожжам. Я. Ів.

Шырока разгорнем сацспаборніцтва на датэрміновае выкананьне фінпляну

Не ўключыліся ў спаборніцтва

У Сеньненскім раёне фінансавая работа пастаўлена з рук вон дрэнна. Раённыя савецкія арганізацыі не ўвязалі гэтай работы з іншымі бягучымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі. Фінплян трэцяга кварталу на 20 жніўня замест 60 проц. выкананы толькі на 16 проц., касавы плян па пазыцыі другой пяцігодкі на 22 проц., па асабоваму страхаваньню на 6 проц. а па ўкладах у ашчадкасы—адліў.

У радзе сельсаветаў (Мащанскі і інш.) да гэтага часу яшчэ ня выпісаны акладныя лісты па сельгаспадатку і абавязковаму акладному страхаваньню.

Загадчыкі райфа і райашчадкасы з 22 ліпеня мабілізаваны ў сельсаветы на іншыя кампаніі і, седзячы там бязвыхадна, яны, аднак, па фінансах ніякай работы не праводзяць.

У райашчадкасе інспэктара няма. Кантралёр зьяўляецца адначасова і касірам. З гэтай прычыны наглядаюцца масавыя выпадкі затрыманьня выдачы ўкладаў.

Замест арганізацыі новых ашчадкас у сельсаветах і наладжаньня ў іх работы, 5 сельскіх ашчадных кас закрыты. Рахункі гэтых кас перададзены ў райашчадкасы. Укладчыкі закрытых кас вымушаны езьдзіць за атрыманьнем укладаў за 20-25 клм. у Сянно. Такое «абслугоўваньне» абыйшлося ашчадкасе ў 19.000 рублёў, адліву ўкладаў апрача невыкананьня пляну лічыцца на 60.000 рублёў.

Для ўключэньня ў сацспаборніцтва на датэрміновае выкананьне фінпляну 3-га кварталу ў раёне нічога ня зроблена.

Шварц.

САЦСПАБОРНІЦТВА НЕ РАЗГОРНУТА

Чавускі раён ня выходзіць з прарыву на важнейшым вучастку—фінансавым. На 20 жніўня квартальны плян выкананы толькі на 24 проц.

Сацдагаворы, які абавязвае ўсе раённыя арганізацыі карэнным чынам перабудаваць сваю работу, шырока разгарнуць сацспаборніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі і паасобнымі насельніцтвамі, мабілізаваць на датэрміновае выкананьне фінпляну ўвесь раённы і сельсавецкі актыў, камсамол і фінсэкцыю,—ня стаў баявой праграмай штодзённай работы раённых арганізацый за пасьпяховае і датэрміновае выкананьне фінансавых задач.

Рад сельсаветаў замест бальшавіцкай барацьбы за фінплян літаральна бязьдзейнічае. **Жалеўскі** сельсавет зрывае фінплян з дэкады ў дэкаду. Старшыня сельсавету **Пчэльнікаў** добра ведае аб сацспаборніцтве, але, як відаць, лічыць, што сацспаборніцтва яго не датычыцца. На запытаньне: «калі будзе выкананы фінплян», адказвае: «а калі панатужымся, тады і выканаем». Калі ён панатужыцца—невядома. Відома толькі, што фінплян па сельсавеце зрываецца бяз усякай натугі.

Упаўпаважаны РК і РВК па гэтым сельсавеце тав. **Старавойтаў**, які няе поўную адказнасьць за работу Жалеўскага сельсавету, ня цікавіцца становішчам работы і зусім ня ведае, што там робіцца.

Ды і дзе там ведаць, калі ён амаль увесь час знаходзіцца «па розных прычынах» у Чавусах.

Старшыня **Рабцоўскага** сельсавету **Турчынаў** за 2 месяцы таксама праваліў плян. Зараз сваю бязьдзейнасьць ён тлумачыць тым, што «ня ўмее работаць». Інакш, як махровым апартуністам гэту заяву кваліфікаваць нельга.

Зарэсьценскі сельсавет за 2 месяцы таксама намабілізаваў 452 руб. альбо 1 проц. пляну. Старшыня сельсавету **Шляханаў** ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб выкананьні фінпляну. Ён нічога ня ведае і аб сацспаборніцтве з Заходнім воблясьцю і паваг аб тым, што фінплян па сельсавеце сорван. Ды ці толькі фінплян сорван. Па гэтым-жа сельсавеце вельмі дрэнна выконваюцца ўсе гаспадарча-палітычныя задачы, а Шляханава гэта быццам і не датычыцца.

Дырэктар банку **

ІЛЬНАЦЕРАБІЛКІ ПРАЦУЮЦЬ ДОБРА,

КАЛІ ІМІ КІРУЮЦЬ СУМЛЕННЫЯ, ПРАВЕРАНЫЯ ЛЮДЗІ

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ МЭХАНІЗАЦЫІ ЎБОРКІ І АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ!

Высокаякасны сырэц—тэкстыльнай прамысловасьці

29-га жніўня апублікавана пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб ільнаазагатоўках. У бліжэйшыя дні кожны калгас, вёска, адналасобная гаспадарка будуць ведаць свой канчатковы план загатовак ільнавалакна, семя, пянькі і канапель.

У адрозьненьне ад паставак збожжа, мяса і бульбы, загатоўкі вышэйназваных тэхнічных культур — важнейшага віду сырцу для сацыялістычнай прамысловасьці — праводзяцца на аснове кантрактацыйных дагавораў. Абавязацельствы, прадугледжаныя ў гэтых дагаворах, павінны быць бязумоўна выкананы абодвума бакамі. Вінаватыя ў парушэньні абавязацельстваў прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Партыя і ўрад не дапусьцяць далей, каб кантрактанты ня выконвалі дагавораў, не здавалі ў тэрмін усю прадугледжаную планам прадукцыю. У той-жа час партыя і ўрад будуць жорстка караць тых работнікаў загатоўчага апарату, хто пасьпяшаецца калгасьнікаў і адналасобнікаў льготамі і перавагамі, прадугледжанымі дагаворамі — атрыманьня хлеба, алею, макухі, прамтавараў і інш.

ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПЕРШАЧАРГОВЫМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА КАЛГАСУ, МТС І АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКІ. Уся прадукцыя, якая застаецца пасьля выкананьня плану, застаецца ў поўным распараджэньні калгасу і адналасобнай гаспадаркі.

Паводле пастановы СНК і ЦК КП(б)Б, у чацьвертым квартале г. г. павінна быць загатоўлена ня менш 80 проц. плану па ільну сялянскай апрацоўцы, а ў першых месяцах 1934 году—20 проц., пянькі — адпаведна 50 і 50 проц. Увесь план загатовак ільнянога і канапляннага семя, трасты і саломы павінен быць выкананы да 1-га студзеня.

У мінулым годзе мы мелі ў радзе месц выпадкі здачы і прыёмкі валакна самай горшай якасьці — гніілой трасты і паклі. Пад уплывам кулацкіх элементаў паасобныя здатчыкі сталі на шлях ашуканьня дзяржавы. Характэрная асабліваасьць загатовак гэтага году — УПОР НА ЯКАСЬЦЬ. Абавязацельствы лічацца выкананымі толькі пры ўмове здачы прадукцыі якасьцю ня ніжэй прадугледжанай дагаворам — здачы закантрактаванага нумару валакна і трасты, і захаваньня процанту чыстаты ільнасемя і канапель.

Разьлікі са здатчыкамі валакна і трасты будуць праводзіцца ў так званых КІЛЁ-НУМАРОХ. Напрыклад, калі гаспадарка закантрактавала 10 кгр. сярэдняга нумару — 8, яна павінна здаць 80 кілё-нумароў. Тады толькі кантрактант выконвае план і атрымлівае апрача грошай прадугледжаных дагаворам льготы і прэміі. Калі-ж кантрактант парушае свае абавязацельствы, здае, прыкладна, 10 кілё валакна шостага нумару, ён выконвае толькі 60 кілё-нумароў і недадае 20. Яму застацца здаць яшчэ стольки кілёграм ільнавалакна і такога нумару, каб атрымалася 20 кілё-нумароў. Ён можа здаць, напрыклад, дадаткова 2 кілё дзесятага нумару, або 3,3 — шостага і г. д.

Але ні ў якім разе не дапускаецца зьмяншэньне колькасных паказальнікаў плану за лік якасных. Нельга замяніць 10 кгр. 8-га нумару, здачай 8 кгр. дзесятага нумару.

За перавыкананьне пляну і захаваньне якасьці кантрактант атрымоўвае на 50 проц. больш хлеба і прамтавараў на адзную звыш пляну колькасьць ільну і пянькі.

Пры здачы, напрыклад, кантрактантам ільнавалакна на поўнумару вышэй устаноўленага сярэдняга, пра выкананьні колькасных паказальнікаў, ён атрымлівае на 10 проц. больш хлеба, на адзную звыш колькасьць, чым устаноўлена нормай, а пры здачы на адзін нумар больш і вышэй—на 20 проц. больш хлеба.

Для БССР устаноўлен сярэдні нумар ільнавалакна — 8. Самыя вышэйшыя нумары павінны здаць Лёзьнянскі, Шклоўскі, Аршанскі і Крычаўскі — ДЗЕСЯТЫ.

Ганаровая задача кожнай раённай арганізацыі так разгарнуць работу, каб ДАБІЦЦА ЗДАЧЫ ВАЛАКНА НЯ НІЖЭЙ ДЗЕСЯТАГА НУМАРУ ПА ЎСЕЙ БССР. Зусім зразумела, што чым вышэй якасьць зданага сырцу, тым лепшыя тавары можа выпрацаваць наша сацыялістычная прамысловасьць.

Усе партыйныя і савецкія загатоўчыя арганізацыі павінны ўжо зараз улічыць усю асаблівасьць загатоўчай кампаніі гэтага году. Дагэтуль у загатоўках ільнапрадукцыі існаваў самацёк, пляны ня выконваліся з году ў год, здавалася нядобраякасная, засьмечаная, недамятая прадукцыя. Паасобныя нядобрасумленныя здатчыкі прывыклі да недысцыплінаванасьці і нядбайнасьці і бязумоўна ў гэтым годзе паспрабуюць зацягваць здачу прадукцыі, вдвозіць на прыёмачныя пункты ільнавалакно дрэннай якасьці. Трэба папярэдзіць, што Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЯ БУДУЦЬ ДАПУШЧАНЫ СПРОБЫ САРВАЦЬ ЗАГАТОЎКІ, ЗДАВАЦЬ НЯДОБРАЯКАСНАЕ ІЛЬНАВАЛАКНО. Трэба так паставіць работу, каб кожны прыёмачны пункт быў поўнасьцю падрыхтован да хуткай прыёмкі ільну і пяньні, каб ён мог свячасова і поўнасьцю разьлічыцца са здатчыкамі.

Задача кожнай партарганізацыі — падабраць бальшавіцкія кадры работнікаў загатоўчай сыстэмы, якія-б здолелі рашуча змагацца з кулацкімі махінацыямі.

СНК СССР і ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 11 жніўня падкрэсьлілі, што загатоўкі ільну і канапель у ільнаводчых раёнах павінны займаць такое-ж месца, як загатоўкі збожжа ў збожжавых. БССР павінна ўзорна правесьці кампанію, стаць у перадавыя рады побач з Маскоўскай, Ленінградзкай і Заходняй вобласьцямі.

Для гэтага, перш за ўсё, трэба дабіцца ўборкі высокаякаснага ільну ва ўстаноўленыя тэрміны, без страт, без парастоляў. Трэба нападзіць кавнэер ва ўсіх працэсах уборкі і першапачатковай апрацоўкі, каб адразу-ж пасьля падняцьця ільну са сьцепішч адпраўляць трасту на ільназаводы, пачаць ручную апрацоўку і зараз-жа здаваць валакно дзяржаве.

БССР ганебна адстае ад іншых абласьцей і рэспублік па ўборцы ільну. Мы ня можам допусьціць далейшага адставаньня. Трэба мабілізаваць усе сілы для сканчэньня ўборкі ў бліжэйшыя дні.

Ф. ВАЙНОВІЧ.

Кулак кіруе апрацоўкай

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Арлейскі і М.-Сітняжскі сельсаветы паўтараюць леташнія памылкі ва ўборцы і перапрацоўцы ільну. На апрацоўку стаяць неправерaных людзей, якія часта шкодзяць у рабоце.

У калгасе «Шлях Леніна» вылучылі адказным за перапрацоўку ільну кулака **Івана Тачыла**, які псуе валакно і семя.

23 жніўня ў брыгадзе на агоне ільну працавалі 4 калгасьніцы: Жак Проска, Крывянкова, Палдуненка і Шустава. Пры агосваньні яны 40 проц. галовак пакідалі ў снапох. Калі ў іх запыталіся, чаму так дрэнна апрацоўваецца лён, яны адказалі: «Брыгадзір Тачыла сказаў, што так вельмі добра».

У гэтым-жа калгасе выцераблены лён спачатку абразалі касой, а потым агосвалі. У брыгадзе Голубева зусім не зварачаюць увагі на якасьць. Капны нізкарослага ільну кучамі застаюцца на полі.

Такі-ж малюнак у калгасе «Бальшавік», дзе таксама спачатку выцераблены лён абразаюць касой, а потым агосваюць, дзе шмат галовак ільну застаецца ў снапох. Калгасьнікі выходзяць на работу, калі ім уздумаецца і канчаюць працу ў 6-7 гадзін. Брыгадзір **Лапенка** выходзіць на работу толькі а 9-й гадзіне раніцы. Ніякага ўліку выпрацоўкі няма. Дзьве калгасьніцы на працягу чатырох дзён выцерабілі толькі 0,17 га, яны вязалі снапы разам з пустазельлем, і не сартавалі лён.

Л. Фрыц.

ДЗЬМІТРА ВОУКАУ
СТ. МЭХАНІК ЛЁЗЬНЯНСКАЙ МТС

Адказ ворагам „Камсамолкі"

Летась мне прышлося працаваць разьязным мэханікам. Для таго, каб даказаць, што ільнацерабілка «Камсамолка» можа добра працаваць, я сам езьдзіў на трактары «Фардзон-Пуцілавец» № 36 на працягу 12 дзён, прычаліўшы да трактару тры «Камсамолкі». Працаваў я ў калгасе «Маяк да сацыялізму», Стасеўска га сельсавету. За 12 дзён выцерабіў 77 га—па 6,5 у дзень. Тады-ж у калгасе «Страх ворагам», Выдрэйскага сельсавету трактарыст **Дрозьдзік** на трох ільнацерабілках за 4 дні выцерабіў 18 га.

На вучастку было ўсяго 12 ільнацерабілак, з іх працавала толькі 6. Чаму не працавалі іншыя? Справа не ў машынах, а ў людзях, у антымэханізатарскіх кулацкіх настроях асобных кіраўнікоў калгасаў. Возьмем хаця-б калгас «Сацбацькаўшчына». Старшыня калгасу Мокры (зараз асуджаны) упарта не жадаў скарыстоўваць «Камсамолкі», не дазваляў трактарыстам вазіць іх на поле.

Сёлета ў МТС ёсьць 62 ільнацерабілкі, яшчэ 16 шт. атрымаем з Бешанковіч. Як мы іх скарыстоўваем. Спачатку пусьцілі іх у Вулаўскім сельсавеце, у калгасе «Бязбожнік». Але старшыня калгасу Пукаў, яшчэ ня пусьціўшы машыны на поле, не пра верыўшы іх падняў крык: «Я гэту машыну не хачу браць».

Пусьцілі машыну на вучастак з дрэнным ільном. Яна не пашла. Такім чынам, сарвалі мэханічнае цераблеьне. Загадчык вытворчага вучастку **Андруп** і агранам **Казакоў** вельмі абыякава аднесьліся да гэтай справы. Зусім інакш аднесьліся да машыны у Завішковічах, дзе загадчык вучастку **Базілеўскі**, агранам **Аболін** і мэханік **Лысянкоў** сур'ёзна ўзяліся за асваеньне ільнацерабілак. Спачатку пусьцілі дзьве «Камсамолкі» ў калгасе «Беларуская вёска». Яны капрызнічалі. Прыехаў мэханік. Адрэгулявалі... машыны пашлі поўным ходам.

У калгасе «Х-ты Кастрычнік» трактарыст камсамолец **Кузьняцоў** бесьпе рапынна працаваў на агрэгаце з трох церабілак і выпрацоўваў у сярэднім у дзень 3 гектары пры высокай якасьці. У калгасе «Чырвоны барацьбіт» калгасьнікі **Навумаў** і **Язычэнка** на адным трактары і трох церабілках выпрацоўваюць у дзень 3 га.

Трактарысты **Бондараў** і **Бабаеў** у калгасе «Чырвоны прамень» працавалі таксама на трох ільнацерабілках і паказалі добрыя рэзультаты.

Адным словам, на вучастку тав. Базылеўскага пашлі ў ход усе машыны, па тры штукі за адным трактарам. Тут дабіліся, што цераблільшчыцы пасьпяваюць за «Камсамолкай» і добра вяжуць выцераблены лён.

На жаль гэты вучастак—выключэньне ў Лёзьнянскім раёне. На іншых вучастках справа значна горш. На вучастку Сутокі трактарыст **Паўкшын Мікола** на трох ільнацерабілках за 4 дні выцерабіў толькі 18 га.

Чаму не працуюць машыны? Бязумоўна не таму, што яны быццам няпрыгодныя. **Не працуюць яны тады, калі калгасы адводзяць для машыннага цераблення горшыя вучасткі.** Моў, «на табе, усё-роўна сапсуеш». **Калі даюць вучасткі, занятыя няроўным, палёгшым, засьмечаным ільном. Не працуюць «Камсамолкі» тады, калі калгасы прымацоўваюць да іх горшых работнікаў, лодыраў і гультаёў. Калі трактарысты ня імкнуцца аўладаць тэхнікай, ня сочаць за ільнацерабілкамі.**

Мой вопыт сьведчыць аб тым, што «Камсамолкі» могуць добра працаваць, калі да іх адносяцца беражна, калі іх правільна рэгулююць, калі даюць ім больш-менш добры вучастак. **У дрэннай працы вінаваты не машыны, а толькі людзі, якія імі кіруюць.** Вінаваты тыя кіраўнікі калгасаў, якія пад уплывам кулацкай агітацыі зрываюць работу церабілак.

ПУСКАЮЦЬ МАШЫНЫ НА ПАЛЁГШЫ ЛЁН

СУРАЖ. Ільняны масыў калгасу «Культура»... Уручную праводзяць цераблеьне ільну калгасьніцы 3-й брыгады т. **Лазоўская.**

— Як, таварышы, норму выконваеце?

— Можа і выконваем—адказвае нам пажылая калгасьніца **Зося Баранава.**

— А якая-ж у вас норма?

— Можа 7, а можа 30. Праўду сказаць, мы і самі ня ведаем. Аб нормах нам нічога брыгадзір не гаварыў — замест Баранавай адказвае не суседка-калгасьніца Ганна Лазоўская.

У груше Ганны Лазоўскай у калгасьніц. Працуюць яны на цераблеьні ільну ужо некалькі дзён і ні адна з іх ня ведае, колькі працадзён яна выпрацавала.

Ніякай увагі не аддаецца якасьці цераблеьня. Лён не сартуецца, у снапох вялікая колькасьць пустазельля.

Калгас «Культура» ігнаруе якасьць уборкі ільну, а такіх калгасаў у раёне нямала.

Дрэнна і з тэмпамі цераблеьня. У калгасе «Кастрычнік» з 62 га ільну выцераблена толькі 21 га. Па ўсім Сураскім раёне плян уборкі ільну выканан толькі на 32 проц.

Такое адставаньне зьяўляецца вынікам дрэннай арганізацыі працы і яўнага ігнараваньня ільнацерабілак.

— Не працуюць ільнацерабілкі, што тут зробіш,—хітра апраўдвае не скарыстаньне двух ільнацерабілак старшыня калгасу «Кастрычнік»—**Чушкін.**

Няпраўда, гэта яўная хлусьня. Гэты Чушкін для таго, каб скампрамэтаваць машыны, пускае ільнацерабілкі на палёгшы, эблытаны лён, а чысты, роўны лён адводзіцца для ручнога цераблеьня.

Чушкін—не адзін. Ва многіх калгасах і сельсаветах наглядаюцца кулацкія, антымэханізатарскія тэндэнцыі. Вось характэрны прыклад. Піша ў МТС старшыня калгасу імя Карла Маркса **Вінаградава:**

«У Сураскую МТС. Паведамляем, што наяўныя ў калгасе 4 «Камсамолкі» стаяць без работы і калгас мяркуе абыйсьціся бяз іх. І таму можаце іх забраць і скарыстаць на іншы патрэбы. Старшыня калгасу **Вінаградава.** Рахункавод **Чэрыкаў**».

Дый што там гаварыць, калі нават у самой Сураскай МТС акапалася зграя кулакоў: **Рыбакоў**—выключаны з калгасу, які меў у мінулым 40 га зямлі; **Зайцаў**—таксама выключаны з калгасу, меў да рэвалюцыі 48 га; **Грыгор'еў**, бацька якога асуджан за шкодніцтва; **Раманоўскі** — сын выселенага кулака; **Капусьцін** і **Зяцькоў**—выключаныя з калгасу і інш. З мэтай зрыву ўборкі гэта хэўра вяла актыўную барацьбу супроць скарыстаньня ільнацерабілак. Былы старшы агранам МТС Шабашоў, калі яму ўказвалі на неабходнасьць скарыстаньня «Камсамолак», звычайна гаварыў:

— Няхай сам Сяліванаў (дырэктар ільнатрактарацэнтру) прыяжджае і працуе на «Камсамолках».

Вось чаму з 66 ільнацерабілак, якія ёсьць у калгасе, амаль ні адна не працуе, як належыць. На двары МТС у самы разгар уборкі стаяць бяз справы 15 добрых ільнацерабілак. На складах МТС валяюцца зусім спраўныя 22 ільнамалатарні «Гільштэйн», месца якім ужо даўно ў калгасах. У той-жа час агос і абмалот галовак ільну ў калгасах фактычна не распачаўся.

А райком, РВК і райвыканкомы ня ведаюць, чаму ўборка ільну праходзіць так марудна.

МІКУЦКІ, ЗАРУБЕЖНЫ.

Сэлекцыйны лён пачарнеў на палёх

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.).

У раёне няма бальшавіцкай барацьбы са стратамі па ільнаўборцы і апрацоўцы.

У калгасе **«Барацьбіт за волю»** лён расьцілаюць з галоўкамі. Дзесяткі пудоў семя пускаюцца на вецер.

У пяршыню ў раёне калгасы **Камянецкага** сельсавету засеялі сэлекцыйны лён. Шмат працы і сіл пакладзена на яго апрацоўку.

А ў выніку сэлекцыйны лён свячасова ў жоўтай сьпеласьці ня быў убран і пачарнеў.

Лявоненка.

Павышэньне расцэнак на ручное цераблеьне ільну

У мэтах стымуляваньня хутчэйшага сканчэньня ўборкі ільну і павышэньня якасьці працы, Наркамзем дазволіў калгасам павысіць расцэнкі работы ў працаднёх калгасьнікам і калгасьніцам, якія працуюць на ручным цераблеьні ільну.

За выкананьне дзеннай нормы выпрацоўкі з адначасовым абавязковым сартаваньнем ільнасаломы калгас мае права налічыць 1,75 працадні, замест устаноўленай раней расцэнкі 1,50 працадня.

(БЕЛТА).

АНТЫМЭХАНІЗАТАРСКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ НЕ СУСТРАКАЮЦЬ АДПОРУ

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.).

5 жніўня ў раёне пачалося масавае цераблеьне ільну. На 25 жніўня плян цераблеьня выкананы на 49,7 проц., з яго абмалочана ўсяго толькі 8,2 проц. Каля паловы перасьпелага ільну стаіць нявыцераблены.

Такія рашаючыя ільнаводчыя сельсаветы, як **Воранскі, Каменскі, Ляхаўскі, Прудокскі і Латыгалицкі,** па сутнасьці толькі што пачынаюць цераблеьне. У гэтых, сельсаветах вы цераблена ад 5 да 13 проц. У калгасе **«Новыя Віркі»** ўвесь лён на плошчы ў 16 га пачарнеў, а церабіць яшчэ не пачалі. Старшыня гэтага калгасу **Зімін** кажа: «Пасьпеем. Чаго сьпяшацца—усёроўна пярпынства ў сацспаборніцтве з калгасам «Зялёная ропча» будзе за намі». Гэты кулацкі агент, заняўшы пасаду старшыні калгасу, зусім сьвядома шкодзіць і зрывае цераблеьне.

Барацьба за якасьць уборкі не пастаўлена ў цэнтр увагі сельсаветаў і праўленьняў калгасаў.

Сартаваньне ільну на корані пры цераблеьні значна паляпшае якасьць ільнавалакна. А ў калгасе **імя Варашылава,** Заціклянскага сельсавету, лён ня толькі не сартуецца па даўжыні сьцяблоў, але цярэбяць разам і лён і пустазельле. Выцераблены лён ляжыць 2-3 дні на полі ня зьвязаным у снопы, ня складзеным у шатры. Гэты-ж калгас злачынна адстае і ў тэмпах цераблеьня. З 34-х га на 20 жніўня было выцераблена толькі 3,7 га.

Брыгадзіры **Багдановіч, Урбан і Казлоўскі** замест арганізацыі ўборкі наладжваюць калектыўныя паходы калгасьніц па ягады. Нормы цераблеьня ня выконваюцца. Церабільшчыцы **Будрэвіч Мар'я, Клачок Аўгеньня, Клачок Марфа, Казлоўская Ф.** убіраюць за дзень толькі тры сотых га і ніхто на гэту нізкую прадукцыйнасьць працы не зварачае ўвагі.

Ня лепш стаіць справа ў калгасе **«Зорка жыцьця»,** Каменскага сельсавету. Тут цярэбяць лён пячыста, шмат блытаюць. Снопы вяжуць вялікія, так што лён ня можа хутка прасыхаць.

У радзе калгасаў назіраецца вялікі разрыў паміж цераблеьнем і абмалотам. У калгасе **«Зялёны востраў»,** Валасоўскага сельсавету, прасушаны лён стаіць на полі больш 9-ці дзён і яго не малоцяць. А ў калгасе **«Чырвоная Полаччына»** выцераблены 2 га звыпраньняга ільну стаялі больш двух тыдняў на полі, трапілі пад дажджы і згнілі.

Пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб тым, каб 30 проц. ільну ў мачанцовых раёнах мачыць іскоўскім палепшаным спосабам, на Лепельшчыне, не ажыцьцяўляецца. Ні райком, ні РВК, ні сельсаветы і парт'ячэйкі аб ажыцьцяўленьні гэтай пастановы і не падумалі.

У раёне не атрымалі рашучага адпору антымэханізатарскія кулацкія тэндэнцыі. З 64 ільнацерабілак «камсамолка» скарыстоўваюцца толькі 35. У калгасах **«Чырвоная зорка», «Чырвоны Кастычнік»,** Ворынскага сельсавету, машыны не працуюць толькі таму, што іх ня здолелі адрэгуляваць. А адсюль вынікае тэндэнцыя—«ільнацерабілкі перэнтабэльныя». У калгасе «Чырвоны Кастрычнік» машыны пасьля доўгага прастою былі адрэгуляваны і маглі быць пушчаны ў ход, але кіраўніцтва калгасу на чале з **Казловым** адмовілася карыстацца церабілкамі і перашло на працу ўручную.

У радзе іншых калгасаў: **«11 ліпеня», «Перамога», імя Розы Люксэмбург** церабілкі стаяць таму, што МТС не паклапацілася падабраць людзей і правесьці патрэбны інструктаж, як працаваць на іх. Ёсьць выпадкі і зусім злачыннага карыстаньня церабілкамі. У калгасе «Чырвоная Мацюшына», Стайскага сельсавету, цярэбяць так, што застаюцца вялікія грабяні нявыранага ільну прычым людзей, каб выцерабіць гэтыя грабяні не паставілі, і яны забіваюцца коламі. Бывае, што машыніст бярэ большую шырыню чым можа захапіць машына. Гэтае злачыннае выкарыстаньне «камсамолак» прыводзіць да таго, што каля 10 проц. ільну гіне і калгас нясе вялікія страты.

Ёсьць факты злачыннага супраціўленьня выкарыстаньню машын Гільштэйна. Брыгадзір першай брыгады калгасу **«Зорка жыцьця» Крывец** разводзіць такую «тэорыю»: «Нявыгадна малаціць лён на машынах, лепш рукамі». За словамі ў Крыўца сьледуюць яўна кулацкія справы. Лён малоцяць рукамі, а ў выніку зацягваецца расьціл.

Лепельскі раён зьяўляецца адным з буйнейшых ільнаводчых раёнаў БССР. Але ніякага пералому ў цераблеьні ільну ў раёне няма. Адны мі рэзалюцыямі райком і райвыканком гэтай справы не пасунуць. Цяпер трэбны не рэзалюцыі, а упартая, шт. д. дзенная арганізацыя калгасьнікаў і працоўных адналасобнікаў на дасяг ховае праведзеньне ўборкі і загатовак ільну, на барацьбу з кулацкім сабатажам і антымэханізатарскімі тэндэнцыямі.

АЛЕСЬ НАЛЕТНЫ.

ХОД АДГРУЗКІ ТАВАРАЎ ВЁСЦЫ

Паводле даных Белкаапсаюзу, прамысловасьць СССР да 20 жніўня адгрузіла вясковай каапэрацыі БССР плянуемых тавараў у разьмеры 47,6 проц. пляну 3 квартану.

Прамысловасьць недагрузіла спажывецкай каапэрацыі плянуемых тавараў на 900 тыс. руб.

Зрываюць адгрузку тавараў вёсцы: **Саюзшвэйзбыт,** які адгрузіў 30 проц. квартальнага пляну па гатовай вопратцы, **гумазбыт**—адгрузіў гумовага абутку—33,6 проц., **Саюзбавоўнаэбыт,** які адгрузіў тэкстыльных тавараў у разьмеры 45,5 проц.

Міжраённыя базы Белкаапсаюзу нездавальняюча выконваюць плян таваразвароту. Віцебская база выканала плян таваразвароту за 5 дзкад па 20 жніўня на 73,6 проц., Бабруйская —на 64,8 проц., Магілеўская — на 53,2 проц.

Наступныя **райспажыўсаюзы** зрываюць плян таваразвароту 3-га квартану: Бешанковіцкі райсаюз да 20 жніўня выканаў 32 проц. пляну таваразвароту, Быхаўскі—31,5 проц., Гарадоцкі—34,5 проц., Глускі—32,1 проц., Дубровенскі—27,4 проц., Сеньненскі—29,4 проц., Калінкавіцкі—32 проц., Парыцкі—29,7 проц. і Нараўлянскі—18 проц.

КАМСАМОЛ ПОЛЬШЧЫ

КСМП працуе ў глыбокім падпольлі, пры бязупынным праследваньні, арыштах і расстрэлах. Саюз налічвае зараз да 17 тыс. членаў і зьяўляецца самай баявой і перадавой арганізацыяй у Камуністычным Інтэрнацыяле Моладзі. З часу сьнежаньскага пленуму арганізаваны новыя мясцовыя арганізацыі, 48 вытворчых ячэек і завербавана звыш тысячы новых членаў. Польскі саюз уладае ленінскім вопытам масавай работы ва ўмовах падпольля.

Ніжэй мы прыводзім цэлы рад прыкладаў з работы камсамолу Польшчы.

У сьнежні па Шлесараўскай мануфактуры адбываецца забастоўка супроць чатырнаццацідпроцантнага зьніжэньня зарплаты. Рабочыя займаюць фабрыку і не пакідаюць яе на працягу двух тыдняў. Побач са стачачным камітэтам працуе дэлегацыя моладзі. Моладзь высоўвае патрабаваньні вызваленьня з турмы свайго дэлегата Ямашэўскага. Дэлегацыя моладзі акружае ножнага ПШС'аўскага члена стачачнага камітэту групаю моладзі, якая сочыць, каб ПШС'аўскія дэлегаты не вялі перагавораў з дырэкцыяй за спіной стачачнага камітэту. КСМП арганізуе на вуліцы дэманстрацыю беспрацоўных, якая займае магістрат, адпаўтаўае сабе 5 злотых *) на арганізацыю хуткай дапамогі і ў далейшым дэманструе перад бастуючай фабрыкай. Дэманстрацыі паўтараюцца амаль штодзённа, і часта справа даходзіць да сутычак з паліцыяй. Па прапанове дэлегацыі моладзі стачком заклікае ўсіх дзяцей народных школ, каб яны аднадзённай забастоўкай падтрымалі змагаючыхся рабочых. Забастоўка ахапіла 70 проц. дзяцей у школах. У горадзе і сярод сялянскага насельніцтва ваколіцы зьбіраюцца харчы для бастуючых. Калі бургмістр фашыст прывозіць воз харчоў, каб уцерпіся ў дапар'е рабочых, рабочыя дапамогі ад яго ня прымаюць, бо той-жа бургмістр паслаў паліцыю супроць беспрацоўных. Дзякуючы вытрымцы, гэту забастоўку рабочыя часткова выйгралі, бо зьніжэньне зарплаты склала ўсяго 8 проц. замест 14 проц.

Арганізацыя ўцягнула дзесяткі тысяч юных тэкстыльшчыкаў ва ўсеагульную забастоўку лодзінскіх тэкстыльшчыкаў (сакавік 1933 г.) яна высунула кіраўніцтва моладзі ў выглядзе стачачных камісій моладзі, працуючых пад кіраўніцтвам стачкому.

Вось некаторыя малюнкі з усеагульнай забастоўкі.

Работа па спыненьні фабрык. Калі забастоўка была абвешчана (6 сакавіка), КСМ арганізоўвае групы бастуючай моладзі (200-300 чал.), якія ходзяць па працуючых яшчэ фабрыках і спыняюць іх. На фабрыку «Ніцзарка» (Відзэўскі раён) прыходзіць група з 200 чал. моладзі, урываецца на фабрычную тэрыторыю і вывозіць працуючых рабочых. Гэта цягнецца да таго часу, пакуль фабрыка ня спыняецца. На Вулганскай вуліцы, дзе знаходзіцца некалькі дзесяткаў дробных і вялікіх фабрык, за першыя дні забастоўкі пастаянна працуюць такія групы, змагаючыяся са шпікамі і штрэйкбрэхэрамі.

Цэнтральная стачачная камісія моладзі склікае мітынгі, на якія прыходзіць 1500-2000 моладзі. Пасьля аднаго з такіх мітынгаў наладжваецца дэманстрацыя перад нямецкім консульствам супроць фашысцкага тэрору ў Германіі і ў Польшчы.

У Пабіяніцах 17 сакавіка моладзь прымае актыўны ўдзел у вулічных баёх, у якіх загінула 7 рабочых. Моладзь каменьнямі праганяе ПШС'аўскага верхавода Рашыля. У часе баёў моладзь спыняе трамвай, паклаўшы тручы забітых на рэйкі. На наступны дзень, пад уплывам агітацыі КСМ, атрад «Стральца» адмовіўся прыняць удзел у фашысцкай дэманстрацыі, якая павінна была адбыцца з прычыны імяніны Цілсудзкага. Да напыянальных сьцягаў, вывешаных у сувязі з нацыянальным сьвятам (19 сакавіка—імяніны Пілсудзкага), моладзь прымацоўвае жалобныя істужкі. У дзьвёх школах дзеці адмовіліся прымаць пукеркі, кажучы: «Нам даеце цукеркі, а бацькам нашым кулі». На пахаваньні забітых прысутнічала 18 тыс. рабочых.

Барацьба з буржуазным друкам. 25 сакавіка буржуазныя газэты выпусьцілі экстраны дадатак аб тым, быццам ліквідавана лодзінская забастоўка тэкстыльшчыкаў, намерваючыся гэтым сарваць забастоўку. На самой-жа справе толькі сацыял-фашысцкія верхаводы падпісалі дагавор, які ануляваў рабочыя патрабаваньні, забастоўка-ж адбывалася далей. Камсамол зараз-жа пасьля зьяўленьня дадатку арганізуе масоўкі ў прафсаюзе і выводзіць адтуль дэманстрацыі да памяшканьняў рэдакцый буржуазных газэт. Лодзінская арганізацыя выдае ў часе забастоўкі 50 тыс. нелегальных выданьняў. Амаль штодзённа зьяўляюцца новыя лістоўкі. Выходзіць бюлетэнь стачачных камісій моладзі «З фронту барацьбы».

Казармы ў часе лодзінскай забастоўкі. Усе казармы абслужаны літаратурай. Наладжваюцца нарады і масоўкі салдат, якія прымаюць рэзалюцыю аб салідарнасьці з тэкстыльшчыкамі, якія змагаюцца. Салдаты клянуцца, што ня будуць страляць супроць рабочых.

Варшаўскі магістрат скарачае выдаткі на школы і рашае ліквідаваць каля 20 прафшкол. КСМП арганізуе ўсеагульную генэральную забастоўку прафэсыянальных школ. Адбыліся масоўкі, на якіх выбіраліся стачкомы. На канфэрэнцыі дэлегатаў-вучняў прафшкол, скліканай магістратам, выступалі ад імя рэвалюцыйнага саюзу вучняў прафшкол (РСМП) 27 прамоўцаў. Па прызыву РСМП прыступілі да забастоўкі каля 20 школ. Адначасова ў Варшаве адбываліся дэманстрацыі вучняў і рабочых. Магістрат вымушан пакуль скасаваць рас парадкаваньне аб ліквідацыі прафшкол.

У Жыхліне (Кутноўская акруга) магістрат у красавіку скасоўвае заваяваную беспрацоўнымі дапамогу натурай, спасылаючыся на пастанову ўраду аб «фондзе працы», якая скасоўвае дапамогу для беспрацоўных і пакіравана на ўвядзеньне прымусовай працы. КСМП сумесна з партыяй арганізуе выступленьні рабочых перад магістратам. 14 дзён 500-700 беспрацоўных асаджваюць магістрат. Мясцовы атрад паліцыі ня можа справіцца. Сьцягваюць іншыя атрады паліцыі, але дэманстрацыя ўсё-ж адбываецца. Магістрат вымушан аднавіць частку дапамог для беспрацоўных.

За люты-сакавік КСМ правёў у 19 валасьцёх (гмінах) кампанію супроць фашысцкіх бюджэтаў. Напрыклад, у волаcьці Лабань (Замойску) на сходзе выступілі моладзьныя прамоўцы з патрабаваньнямі выкрэсьліць з валаснога бюджэту выдаткі на «Стральца», на «Лігу паветранай абароны» і «П. В.» («ваенная падрыхтоўка»), скасаваньня абавязковай дармовай работы пры рамонце дарог (шарваркі), перанясеньня ўсіх падаткаў на памешчыкаў і кулакоў, прыбаўленьня фонду на школы, на беспрацоўную моладзь, на хату для сялянскай моладзі і г. д. Апрача таго была прынята рэзалюцыя супроць пазбаўленьня рабочай моладзі ў валасьцёх ад 21 да 23 год права голасу (на падставе апошняга статуту самакіраўніцтва).

З вёскі Навасёлкі (Гародзеншчына) прыбылі 3 сэквэстратары з 5 паліцэйскімі, каб сабраць падаткі. Камсамольская арганізацыя вёскі неадкладна разаслала на конях «чырвоных ганцоў» ва ўсе вакольныя вёскі, папярэджваючы іх аб налёце паліцыі і сэквэстратараў. Ня гледзячы на тое, што ў вёсках было мала народу, бо многія паехалі ў лес па дровы, усё-ж сабралося некалькі сот сялян, якія акружылі вёску Навасёлкі з усіх бакоў з намерам абязброіць паліцыю. Аднак паліцыя свячасова змылася. Дэманстрацыя сялян уступіла ў вёску. Пасярэдзіне вёскі адбыўся мітынг мясцовых і прыбыўшых сялян, на якім выступалі прадстаўнікі партыі і камсамолу, указваючы, што салідарнай барацьбой сяляне могуць абараніць сваю сялянскую маёмасьць ад фашысцкіх грабіцеляў.

У Верхняй Сілезіі фашысты пасьля прыходу Гітлера да ўлады наладзілі так званы «тыдзень паўстанцаў» пад лёзунгам «бі марксыстаў, немцаў і жыдоў». Фашысцкія банды цягаліся па рабочых раёнах, грабілі рабочыя памяшканьні і г. д. У Вялікіх Гайдуках камсамол арганізаваў дэманстрацыю моладзі, якая прагнала такую банду, прабаваўшую разграміць памяшканьне беспрацоўнай моладзі.

У сакавіку-красавіку ў часе прызыву ў армію 1911 г. камсамол арганізаваў масавую кампанію сярод прызыўнікоў. 4 цягнікі з прызыўнікамі былі поўнасьцю заваяваны. Вось апісаньне заваяваньня аднаго цягніка ў Верхняй Сілезіі (Дамброўскі басэйн, Кракаў-Львоў). «У Верхняй Сілезіі адбыліся разьвітальныя мітынгі з прызыўнікамі, наладжаныя КСМ і рэвалюцыйным саюзам прызыўнікоў. На станцыі Стшэмешыцэ (Дамброўскі басэйн) прызыўнікоў сустрэла дэманстрацыя 300 рабочых. На вокнах зьяўляецца транспарант. Выступае прызыўнік. Цягнік крапаецца са сьпевам «Інтэрнацыяналу». На вузлавой станцыі Льгалава да саставу прычапілі два вагоны з прызыўнікамі іншых мясцовасьцяй. Яны таксама далучаюцца да дэманструючых рабочых. Паліцыя прабуе арыштаваць некаторых, больш бушуючых рабочых. Маса не дазваляе. Толькі калі цягнік прыбыў у Львоў, паліцыя акружае яго і праводзіць масавыя арышты сярод прызыўнікоў, адданых потым у жарны батальён.

У першамайскай кампаніі 3 атрады ТУ

У КРАІНЕ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ

Да працэсу аб падпале рэйхстагу

ЛЁНДАН, 31. (Белта). Відныя буржуазныя палітычныя дзеячы і пісьменнікі (сярод іх пэрд Рыдынг — былы віце-кароль Індыі) скіраваюць мэмарандум германскаму ўраду аб падпале рэйхстагу і ў прыватнасьці аб абыходжаньні нацыянал-сацыялісцкіх упад з Торгплера. Прынята пастанова — аднасоюз з Лейпцыгскім працэсам, арганізаваць контрпрацэс у Лёндане, пры ўдзеле віднейшых юрыстаў усяго сьвету.

***

БЭРЛІН, 1. (Белта). Галяндзкі адвакат ПАУВЭЛЬС заявіў аб сваёй згодзе ўзяць на сябе абарону Ван дэр-Любэ. Газэты паведамляюць, што Паўвэльс зьнёсься з членамі міжнароднага камітэту юрыстаў — адвакатам БРАНТЫНГАМ і францускім адвакатам ДЖАФРЫ. У інтэрв'ю з прадстаўніком галяндзкай «ТЭЛЕГРАФ» Паўвэльс заявіў, што ён пічыць сваёй задачай «выратаваць галаву Ван дэр-Любэ ад вяроўкі і сякеры». Самога-ж Ван дэр-Любэ ён разглядае, як «бязгпуздага чалавека», зрабіўшага падпал рэйхстагу пад уплывам палітычнага цкаваньня. Паувэльс заявіў таксама, што калі яму ня ўдасьцца выступіць на судзе ў якасьці абаронцы, дык ён мае намер прадставіць суду паказаньні, якія памякчаюць віну падсуднага.

Агенцтва «Вольф» распаўсюджвае паведамленьне з «аўтарытэтных крыніц», што ні суд ў Лейпцыгу, ні афіцыяльна назначаны абаронца Ван дэр-Любэ не атрымлівалі ніякіх зоў ад Паувэльса.

Рад газэт публікуе, як відаць, інспіраванае паведамленьне з Лейпцыгу, што суд будзе разьбіраць справу Ван дэр-Любэ і іншых абвінавачаных у падпале рэйхстагу не паддаючыся націску міжнароднага камітэту юрыстаў, апублікаваўшага розныя матар'ялы, якія датычаць падпалу рэйхстагу. У паведамленьні далей гаворыцца, што суд асудзіць Ван дэр-Любэ і іншых абвінавачаных у падпале рэйхстагу.

Што-ж датычыць усяго, што публікуецца па данай справе заграніцай, дык,— паводле слоў гэтага паведамленьня,— «яно можа быць прынята пад увагу пры судовым разборы ў Германіі толькі ў тым выпадку, калі факты, на якіх заграніцай настойваюць, будуць разгорнуты настолькі пераканаўча, што суд зможа скарыстаць іх у якасьці матар'ялу, які мае сілу юрыдычнага доказу ў далейшым разборы справы аб падпале рэйхстагу.

Прыезд п. Эдуарда Эрыё ў Маскву

МАСКВА, 1. (Белта). Учора, у 9 гадзін 40 мінут вечара, хуткім цягнікам з Растова прыбыў у Маскву Эдуард Эрыё ў суправаджэньні францускага пасла ў СССР п. Альфана, сэнатара Сэрлена, былога начальніка габінэту старшыні савету міністраў Марсэля Рэя, дэпутатаў Жульена і Маргена.

На вакзале Эдуард Эрыё быў спаткан нарэшце замежных спраў тав. М. М. Літвінавым, яго намесьнікамі тав. Н. І. Крэсьцінскім, і тав. Л. М. Караханам, старшынёй Масаблыяканкому тав. Г. П. Камінскім, старшынёй Массавету тав. Буланіным, тав. С. Е. Малышэвым, нам. старшыні ВОКС тав. Е. Лернэр, францускім пасольствам у поўным складзе на чале з дарадцай пасольства п. Пайяр, адказнымі работнікамі наркамату замежных спраў, прадстаўнікамі савецкага і замежнага друку і інш.

Сустрэча насіла цёплы і прыязны характар. Эрыё заявіў, што ён вынес з паездкі найлепшыя ўражаньні.

Прыём п. Эдуарда Эрыё і францускага пасла п. Альфана тав. В. М. МОЛАТАВЫМ

2-га верасьня, у 12 гадзін дня, старшыня СНК СССР тав. В. М. Молатаў прыняў п. Эдуарда Эрыё і францускага пасла п. Шарля Альфана. Гутарка цягнулася да 1-ай гадзіны дня.

Падпісаньне пакту аб дружбе, ненападзе і нэйтралітэце паміж СССР і Італіяй

РЫМ, 2. (Белта). Агенцтва «Стэфані» паведамляе: «Сёньня Мусаліні і паўнамоцны прадстаўнік СССР тав. Пацёмкін падпісалі пакт аб дружбе, ненападзе і нэйтралітэце паміж Італіяй і СССР».

Заходня-беларуская вёска ў абцугох голаду і галечы

ВАРШАВА, 1 (БЕЛТА) «КУР'ЕР ПОРАННЫ» дае наступнае апісаньне голаду ў САРНЕНСКІМ ПАВЕЦЕ (ПАЛЕСЬСЕ): «Толькі 3-ая частка ўсёй вораной зямлі ў руках беднякоў. Больш паловы гэтых гаспадарак належыць да так званых карлікавых гаспадарак. Паўтара, два, тры і навет 4 га ў Палесьсі ня здольны пракарміць зямляроба і яго сям'ю. Як правіла ДА СТУДЗЕНЯ КАН ЧАЮЦЦА ЎСЕ ЗАПАСЫ ХЛЕБА. У САКАВІКУ Ў СЕЛЯНІНА ЎЖО НЯМА БУЛЬБЫ. Асноўнае харчаваньне сялян вясною — шчаўе. У некаторых вёсках ЦЭЛЫЯ СЕМ'І ЛІТАРАЛЬНА ПУХНУЦЬ З ГОЛАДУ. Бывалі выпадкі калі СЯЛЯНЕ ПАМІРАЛІ З ГОЛАДУ НА РАБОЦЕ Ў ПОЛІ. Цукру ўжо даўно ня купляюць. У некаторых вёсках нельга знайсьці солі: Большасьць хат асьвятляецца лучынай, газавая лямпа — пры віпеся самых багатых гаспадарак. Агонь здабываецца пры дапамозе крэмню».

У артыкуле аб катастрафічным падзеньні цэн на прадукты сельскай гаспадаркі газэта «АБЦ» робіць вывад, што заработак селянскай сям'і пры сярэдняй ураджайнасьці на 10 маргох пры цяперашніх цэнах на с.-г. прадукты складае каля 60 злотых у месяц. —«На гэтыя 60 злотых, — піша «АБЦ», — селянін павінен пракарміць сям'ю, заплаціць падаткі, адзецца, купіць такія-сякія прылады для гаспадаркі, заплаціць даўгі і паслаць дзяцей у школу».

ПАЗШ узмацняюць свае сілы ў Ціхім акіяне

Токіё, 1 (Белта). Заява начальніка аперацыйнага кіраўніцтва ваеннаморскага міністэрства ПАЗШ Стэндля аб рашэньні пакінуць атлянтычны флёт у Ціхім акіяне на неакрэслены тэрмін выклікала каментарыі ў морскіх колах, па думцы якіх «гэта рашэньне паказвае, што ўрад Рузвэльта на ліпіць становішча на Далёкім Усходзе ўрэгуляваным, пры чым урад Рузвэльта разглядае Далёка-Ўсходнюю праблему так сама, як і ўрад Гувэра.

Консульскі корпус у Харбіне патрабуе забесьпячэньня бясьпечнасьці чужаземцам у Манчжоу-Го

УЛАДЗІВАСТОК, 1. (Белта). Згодна паведамленьня з Харбіну, 28 жніўня адбылося бурнае пасяджэньне консульскага корпусу, скліканае ў сувязі з новай хвалай бандытызму і вялізарнай колькасьцю выпадкаў уводу кітайцаў і іншаземных грамадзян бандытамі ў мэтах атрыманьня выкупу.

Выступаўшыя іншаземныя консулы крытыкавалі створанае становішча, бязь дзейнасьць мясцовых улад і ўказвалі, што калі ўлады ня могуць захаваць бясьпечнасьць, дык яны абавязаны аказаваць выдачу імі забраных свакром выкупляць палонных. Японскі консул, каб супакоіць сход, абяцаў, што ўлады прымуць меры для забесьпячэньня парадку. Консульскім корпусам прынята рашэньне прапанаваць перад уладамі з поваду створанага становішча.

Забойства германскага прафэсара Лесінга

ПРАГА, 31 (Белта). Ноччу ў Марыенбадзе, за 20 км. ад баварскай граніцы забіт германскі прафэсар ЛЕСІНГ. Забойцу— нейкага Экерта — нядаўна бачылі разам з адным германскім грамадзянінам. Лічаць, што забойства зроблена на палітычнай глебе. Лесінг займаў кафэдру філёсофіі і пасьля прыходу да ўлады нацыянал-сацыялістаў эміграваў у Чэхаславакію. Яго кватэра ў Гансвэры была зруйнавана нацыянал-сацыялістамі і маемасьць канфіскавана.

ПРАГА, 1 (Белта). Друк адпадушна прыхоўваць да вываду, што ініцыятараў забойства Лесінга трэба шукаць у Германіі. Газэты асабліва падкрэсьліваюць, што цэнтральны орган германскай нацыянал-сацыялісцкай партыі «Фёлькішэр Бэобахтэр» апошнім 27 жніўня рабіў надзвычай рэзкія выпады супроць Лесінга. Указваючы на стварэньне ў Германіі легёну з нацыянал-сацыялісцкіх бежанцаў з Чэха-славакіі друк патрабуе забароны нацыянал-сацыялісцкай партыі.

Замежная хроніка

* Камісія меджлісу (пэрсыдзкі парлямант) па замежных справах зацвердзіла лёнданскую канвэнцыю азначэньня агрэсора.

* Сёньня ваенны міністар Японіі Араікі дакладваў у савеце міністраў аб скончэньні пабудовы Гірын-Хайрэнскай чыгункі, якая злучае Кірэю з Манчжуріяй. Дарога 1-га верасьня фармальна перадана манчжурскаму ўраду з тым, што апошні неадкладна перадасьць яе ў ведамстве Паўднёва-Манчжурскай чыгункі, якой перададзены ўсе чыгункі Манчжоу-Го.

* У Данцыгу праведзены вобыскі ў бюро партыі нацыяналістаў, так сама на кватэрах паасобных членаў партыі. Вобыскі матывуюцца тым, што прыхільнікі нацыяналістаў займаліся антыдзяржаўнай дзейнасьцю.

* Як паведамляе агенцтва Конці, захоплены 27 жніўня германскімі штурмавікамі на швэйцарскай тэрыторыі чэхаславацкі грамадзянін Вэбэр быў 29 жніўня выдан швэйцарскім урадам у Рамэзэне.

* На падставе нядаўнага дэкрэту, германскага ўраду ў радзе галін прамысловасьці створаны карталі. Вызначаючы канкурэнцыю, яны ўводзяць высокія манапольныя цэны. Рад тавараў падаражэ на 20-30 проц. Адначасова даражаюць прадметы масавага ўжытку.

ПАБУДУЕМ ЭСКАДРЫЛЬЛЮ ІМЯ т. КАГАНОВІЧА

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ТЭМПЫ ЗБОРУ СРОДКАЎ

НА БЯГУЧЫМ РАХУНКУ—647.368 РУБ.

За 31 жніўня на бягучы рахунак паступіла ад арганізацый і ўстаноў г. Менску 4.805 руб., з раёнаў: Магілеўскага — 799 руб., Рэчыцкага—500 руб., Бягомльскага—363 руб. і Мсьціслаўскага—1.033 руб. Усяго за дзень паступіла 7.501 руб.

За 1 верасьня на бягучы рахунак пабудовы эскадрыльлі імя т. Кагановіча паступіла ад арганізацый і ўстаноў г. Менску 1.946 руб. Паступіла з раёнаў: Віцебскага—30.000 руб., Магілеўскага—1.635 руб., Жлобінскага—1.598 руб., Быхаўскага — 1.432 руб., Дубровенскага—169 руб., Лагойскага—505 руб. Усяго за 1 верасьня паступіла 39.335 руб.

За 2 верасьня на бягучы рахунак паступіла 7.279 руб.: ад арганізацый і ўстаноў г. Менску 2.132 руб., з раёнаў: Бабруйскага—3.800 руб. і Сеньненскага—1.347 руб.

З пачатку збору на бягучы рахунак паступіла 647.368 руб.

Уносяць і выклікаюць

* Быхаўскі саюз будаўнікоў упёс на пабудову эскадрыльлі імя т. Кагановіча 80 руб. і выклікае пасьледаваць яго прыкладу астатнія саюзы Быхаўскага раёну.

* Калгасьнікі калгасу «Чырвоная Вязьма», Дунайкоўскага сельсавету, Быхаўскага раёну ўнесьлі на пабудову эскадрыльлі імя т. Кагановіча 196 руб. і выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу ўсе калгасы Быхаўскага раёну.

* Працоўныя Дрысенскага раёну ўносяць на пабудову эскадрыльлі 2.350 руб. Збор сродкаў працягваецца.

* Рабочыя і служачыя Лубяніцкага прарабскага лесавучастку (Быхаўскі р.) зрабілі суботнік і зароблены грошы перадалі ў фонд пабудовы эскадрыльлі.

Заява Ван дэр-Любэ

ПАРЫЖ, 31. (Белта). Газэта «ТАН» прыводзіць наступнае тэлеграфнае паведамленьне з АМСТЭРДАМУ:

«На допыце Ван дэр-Любэ заявіў, што ён не знаём з членамі германскай кампартыі, Гэта заява Ван дэр-Любэ была ўнесена ў пратакол толькі пасьля таго, як перакладчык галяндзкага пасольства, сказаў, што ён ў працўным выпадку не падпіша пратаколу.

Германскія ўлады больш не запрашаюць гэтага перакладчыка».

Зьезд нацыянал-сацыялістаў у Нюрэнбэргу

Пасяджэньні адбываюцца пры зачыненых дзьвярох

БЭРЛІН, 1 (БЕЛТА). На зьезьдзе нацыянал-сацыялістаў у Нюрэнбэргу пры зачыненых дзьвярох адбываліся пасяджэньні камісій, у якіх выступалі кіраўнікі раду нацыянал-сацыялісцкіх арганізацый. Статс-камісар Бэрлінг Лі пэрт указаў, што ў 1932 г. муніцыпалітэты расходвалі на дапамогі на беспрацоўі звыш 1 мільярду марак. У 1933 г. зрасходуюць каля 620 млн. дэфіцыт абшчын каля 1.100 мільёнаў марак, альбо 6, частка гадавой патрэбнасьці муніцыпалітэтаў у датацыях. Запазычанасьць муніцыпалітэтаў—11,3 млрд. марак (1 проц. складае 720 млн. марак штогод). Для выхаду з такога становішча Лінэрт прапанаваў «рэарганізацыю фінансавай і падатковай сыстэмы».

Газэты паведамляюць, што нацыянал-сацыялісцкае кіраўніцтва імкнецца, каб у будучым абшчыны «не знаходзіліся на ўтрыманьні дзяржавы і правінцый».

***

БЭРЛІН, 31 (БЕЛТА). Паводле даных міністэрства фінансаў, калі ўлічыць дэфіцыт, што астаўся ад мінулага году, дык у канцы лістапада 1933 году дэфіцыт складзе 1.619,8 млн. марак, супроць 1.560,1 млн. марак у канцы чэрвеня.

Рэвалюцыйны рух у польскай арміі

ПАРЫЖ, 1 (ТАСС). «ЮМАНІТЭ» паведамляе аб узмацненьні рэвалюцыйнага руху СЯРОД ПОЛЬСКІХ САЛДАТ. У ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ эшалён конніцы, якія адпраўляліся з прызыўных пунктаў у вайсковыя часьці, ВЫВЕСІЎ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ і СЬПЯВАЎ УСЮ ДАРОГУ «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». У выступленьні прымала ўдзел 540 навабранцаў. У часе дэманстрацыі бастуючых рабочых у ПУЛАВАХ адбыліся групавыя сходы рэвалюцыйных салдат, якія зьвярнуліся да рабочых з наступным лістом: «Мы на вашым баку. Мы заўсёды былі гатовы і гатовы цяпер падтрымаць вашу барацьбу. Сярод нас няма здраднікаў справе рабочай клясы. НІХТО З НАС НЯ БУДЗЕ СТРАЛЯЦЬ У ВАС, КАЛІ ВЫ ПАТРАБУЕЦЕ РАБОТЫ І ХЛЕБА. Мы заяўляем, што дамо адпор фашысцкім бандам і паліцыі. Мы знойдзем спосаб дапамагчы бастуючым у Пулавах, якія працягваюць барацьбу, ня гледзячы на пагрозы газавай атакай і расстрэлам».

Паўпэрызацыя працоўных мас Германіі

БЭРЛІН, 2 (БЕЛТА). У справаздачы статс-кіраўніцтва зварачвае на сябе ўвагу падзеньне паступленьняў ад падаткаў на зарплату з 196,7 млн. марак за 3 месяцы мінулага году да 182,4 млн. у г. г. Гэта сьведчыць аб далейшым зьмяншэньні даходаў працоўных. Паступленьні ад падаткаў на табак, цукар і піва зьнізіліся ў параўнаньні з леташнімі адпаведна на 82,15 млн. марак, што гаворыць аб працягу ў г. г. зьніжэньня спажываньня гэтых прадметаў першай неабходнасьці. Паказальна, што майскія расходы на армію на 10 млн. марак больш красавіцкіх і на флёт — на 5. Расходы на кіраўніцтву ўзрасьлі на 16 млн.

***

БЭРЛІН, 1 (БЕЛТА). Распараджэньнем міністра народнай гаспадаркі ў папяровай прамысловасьці з 1 верасьня па 31 кастрычніка ўводзіцца пяцідзённы тыдзень. Скарачэньне вытворчасьці матывуецца перавытворчасьцю і зьмяншэньнем экспарту. Саюз прадпрыемцаў джутавай прамысловасьці загадаў сваім членам абмежаваць вытворчасьць на 10-15 проц. магутнасьці фабрык.

96 тысяч беспрацоўных інтэлігентаў у Румыніі

ВЕНА, 1 (БЕЛТА). Выбушы румынскі міністар сацыяльнага забесьпячэньня БАНУ апублікаваў у журнале «Гігіена сачыяла» вынікі свайго дасьледваньня становішча работнікаў разумовай працы, скончыўшых на працягу апошніх год вышэйшыя навучальныя ўстановы. Гэта катэгорыя беспрацоўных налічвае 96 тыс. чалавек. Большасьць з іх ня мае ніякіх пэрспэктыў на работу. Беспрацоўных настаўнікаў народных школ у Румыніі каля 12 тысяч; беспрацоўных настаўнікаў сярэдніх школ — 8 тысяч, фармацэўтаў — 4.500, дактароў—звыш 3 тысяч, юрыстаў — 1.500, мастакоў 1.500.

С У Д

Справа аб масавым захворваньні на Цянскіх торфараспрацоўках

Вячэрняе пасяджэньне 31 жніўня

Дапытваецца падсудны Кліёнскі. Хоць на папярэднім сьледзтве ён пры знаў сябе вінаватым, але на судзе высоўвае цэлы рад «аб'ектыўных» прычым, імкнецца даказаць сваю нявінаватасьць.

— Чаму-ж вы, як доктар-спэцыяліст, маючы вопыт і практыку аб падобных захворваньнях не змаглі прадбачыць магчымага паўтарэньня захворваньня? —ставіць ва ўпор перад Кліёнскім пытаньне старшыня суда Абрамаў і дзяржаўны абвінаваўца Курачкін.

Так, мая ў гэтым віна, я павінен быў гэта ўлічыць і прадбачыць,—адказвае Кліёнскі.

— Скажэце, як магло здарыцца, што, як вы загадчык лячэбнай часткі гараховы здароўя даведаліся аб захворваньні толькі праз суткі. Ці ня вынікае гэта са стану працоўнай дысцыпліны мэдпэрсаналу, з фармальна-бюракратычных, казённых адносін да выкананьня ім сваіх абавязкаў, са стану агульнай пастановкі мэдычнага абслугоўваньня працоўных і мэтадаў кіраўніцтва—гэтым абслугоўваньнем з боку гараховы здароўя,—задаецца другое пытаньне Кліёнскаму.

Пастаўлены перад бясспрэчным фактам, Кліёнскі прымушан быў прызнацца.

— Так, інакш вытлумачыць гэтага нельга.

На пытаньне, чаму Кліёнскі па прыезьдзе на месца захворваньня ня прыняў ніякіх мер па прывядзеньні інтэрнатаў, сталовай, кухні і наогул пасёлку рабочых у добры санітарны стан, таксама быў дан вымушаны адказ:

— Зрабіў упушчэньне, прызнаю сваю віну.

Такім чынам, усе «аб'ектыўныя» прычыны адпалі. На іх месца выплылі фармальна-бюдушныя адносіны да абслугоўваньня рабочых, саноўна-барскія мэтады кіраўніцтва мэддапамогай з боку гараховы здароўя, адсутнасьць усякай адказнасьці да выкананьня сваіх абавязкаў з боку мэдпэрсаналу.

Падсудная доктар Мышкоўская таксама імкнецца давесьці, што яна ні ў чым не вінавата. Даведаўшыся аб захворваньні Мышкоўская зараз-жа выяжджае з Эльводу на торфараспрацоўкі і працуе там «не пакладаючы рук». Але хіба справа толькі ў гэтым? Мышкоўская, як доктар мэдпункту Эльводу адначасова зьяўлялася доктарам мэдпункту торфараспрацовак. Яна абавязана была рэгулярна, ня менш двух разоў у пяціднёўку наведваць торфараспрацоўкі, сачыць за санітарным становішчам інтэрнатаў, сталовай, кухні. Мышкоўская-ж, як правіла, наведвала торфараспрацоўкі толькі адзін раз у пяціднёўку. Прычым, прыяжджаючы туды яна зусім ня цікавілася бытавымі ўмовамі рабочых, а фармальна, паказённаму праводзіла прыём хворых і адразу-ж варочалася назад.

Прыбыўшы на торфараспрацоўкі ў часе захворваньня Мышкоўская не знайшла там «нічога сур'ёзнага». Аглядаючы хворых яна залэфуніла трыкутнік, што ёсьць шмат сымулянтаў. Усім прыяжджаючым з гораду, у тым ліку і намесьніку старшыні гарсавету т. Каранеўскаму, Мышкоўская гаварыла: «Усё прайшло, нічога сур'ёзнага няма».

Падсудны доктар Файнбэрг—загадчык станцыі хуткай дапамогі, вінаватым сябе не прызнае. Па яго думцы, ён зрабіў усё, што ад яго залежала. Патрабавалася замена Мышкоўскай,— ён зьняў з начнога дзяжурства доктара Гінзбурга і прапанаваў яму вопну ехаць на торфараспрацоўкі. У тым-жа, што Гінзбург прыехаў туды раніцой, у 8 гадзін, Файнбэрг сябе вінаватым ня лічыць. Больш таго, паслаўшы Гінзбурга для замены і канкрэтнай работы на аказаньні хворым дапамогі, Файнбэрг па тэлефону, дазваляе яму вярнуцца назад, хоць становішча на торфараспрацоўках было вельмі сур'ёзнае.

Вячэрняе пасяджэньне 1 верасьня

Перад судом клянецца ў сваёй нявіноўнасьці падсудны доктар Гінзбург. Ён датаварваецца нават да таго, што калі яго пасылаў Файнбэрг на торфараспрацоўкі, то ніякага канкрэтнага заданьня ня было дадзена і што толькі выпадкова сустрэўшыся з Кліёнскім, апошні нібыта даручыў яму зрабіць эпідэміялёгічнае абсьледваньне. Ні аб якай замене Мышкоўскай і канкрэтнай рабоце на торфараспрацоўках Файнбэрг быццам яму не гаварыў.

Атрымлівацца вельмі дзіўны малюнак. Гінзбург цьвердзіць суду, што Кліёнскі даручыў яму зрабіць эпідэміялёгічнае абсьледваньне. Кліёнскі тут-жа абвяргае гэта, заяўляючы, што такога даручэньня не даваў. Гінзбург цьвердзіць, што ні аб якой замене Мышкоўскай Файнбэрг яму не гаварыў. Файнбэрг-жа гаворыць, што такое распараджэньне было.

Зачараванае кола! Але пасьля некалькіх пытаньняў Гінзбургу з боку старшыні суда і дзяржаўнага абвінавайцы, заслона адкрываецца. Твар Гінзбурга—дэзэртыра з баявога фронту—адразу-ж выкрываецца.

— Вас пасылалі на торфараспрацоўкі ноччу. Ці ня ясна было з гэтага, што справа вельмі тэрміновая і таму, чаму вы не запыталі, чаго вас туды пасылаюць?—запытвае старшыня суда Абрамаў.

— Я сьпляшаўся, і забыў запытацца.

— Сьпляшаліся. А чаму-ж замест 12 гадз. ночы, прыбылі на торфараспрацоўкі раніцой?

Гінзбург не знаходзіць адказу.

— Вы сьцьвярджаеце, што аб замене Мышкоўскай і канкрэтнай рабоце па аказаньні дапамогі хворым Файнбэрг вам нічога не гаварыў. Чаму-ж вы званілі Файнбэргу, што на торфараспрацоўках усё добра, няма нічога сур'ёзнага і прасілі дазволу вярнуцца назад?

Гінзбург выкручваецца:

— Я ня змог дазваніцца да Кліёнскага.

І далей ён выдае сябе з галавой. На запытаньне дзяржаўнага абвінаваўцы:

— Якія-ж вынікі вашага эпідэміялёгічнага абсьледваньня?

Гінзбург адказвае: «Канкрэтна нічога не зрабіў, бо там было ўсё добра».

Як быццам эпідэміялёгічнае абсьледваньне можна рабіць толькі ў часе масавага захворваньня.

Суд дапытвае падсуднага Саньнікава. Яму, як дырэктару торфараспрацовак, ставіцца ва ўпор пытаньне наконт увагі бытавому абслугоўваньню рабочых.

— Чым вытлумачыць такое жудаснае антысанітарнае становішча ў інтэрнатах, вакол іх, у сталовай і на кухні?

— Я быў загружан работай па выкананьні прамфінпляну.

— А як вы лічыце, чыстата спрыяе выкананьню прамфінпляну ,ці наадварот?

Саньнікаў ухіляецца ад простага адказу. Ён імкнецца ўсю віну ўскласьці на свайго памочніка, камэнданта, загадчыка сталовай, прыбіральшчыц і работнікаў мэдпункту.

— Іх абавязак—сачыць за чыстатой і наводзіць санітарнае становішча, — заяўляе Саньнікаў.

Каб адразу-ж выкрыць усю бязьдзейнасьць Саньнікава і яго напрывацельскія адносіны да бытавога абслугоўваньня рабочых, старшыня суда зачытвае шмат актаў аб антысанітарным становішчы пасёлку, на якія Саньнікаў, зусім не рэагаваў.

— Аб гэтых актах я зусім ня ведаю, —гаворыць Саньнікаў.

— Тым горш для вас—адказвае дзяржаўны абвінаваўца. Вы ня ведалі аб актах таксама як і аб санітарным становішчы пасёлку.

Бязьдзейнасьць, саноўна-барскія бяз душныя адносіны да запатрабаваньняў рабочых Саньнікаў праяўляў як у часе ўсяго сэзону, так і ў момант масавага захворваньня рабочых. На працягу амаль трох дзён ён і не падумаў аб прыняцьці экстраных мер па навядзеньні чыстаты ў бараках і наогул на пасёлку. І толькі пасьля таго, як гарсавет катэгарычна прапанаваў гэта зрабіць, чыстата была наведзена.

Апошнім дапытваецца падсудны Каханоўскі. Ён больш шчыры за Саньнікава, хоць таксама імкнецца зьмякчыць сваю віну, матывуючы адрывам у службовыя камандыроўкі.

Каханоўскі прызнаецца, што паміж ім—памочнікам дырэктара, і самім дырэктарам ня былі выразна разьмежаваны функцыі работы, панавала форменная абязьлічка. Усе адказвалі за ўсё, а канкрэтна—ніхто ні за што. У сталовай і на кухні быў бруд, як кажуць, па вушы. Гэта бачылі ўсе, але мер ніякіх ня прымалі.

Прыкідваючыя Іванам «непомнящым» Каханоўскі гаворыць. Мы лічылі, што за санітарнае становішча сталовай адказвае тарфкоп, а апошні нам у адміністрацыйным парадку не падначален.

Сьмешна, але гэта факт. Гаспадарлікі лічылі, што іх справа патрабаваць ад рабочых тэмпаў і якасьці работы, а складаньне патрэбных умоў для работы іх не датычыла. Ці не зьяўляецца гэта простым ігнараваньнем і сабатажам указаньняў партыі аб паляпшэньні бытавога абслугоўваньня рабочых? Так і толькі так трэба падыходзіць да кваліфікацыі злачынства падсудных.

Ад кіраўніцтва Упаўкамзаг СНК СССР па БССР

Даводзіцца да ведама ўсіх загатоўчых арганізацый, што ў АПАРАЦЕ ЎПАЎКАМЗАГ СНК СССР ПА БССР УСТАНОЎЛЕНА НА ЎВЕСЬ ЧАС ЗАГАТОВАК С.-Г. ПРАДУКТАЎ ДЗЯЖУРСТВА АДКАЗНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ З 17 ДА 23 ГАДЗІН НОЧЫ, А Ў ВЫХАДНЫЯ ДНІ (6, 12, 18 і Г. Д.) З 10 ГАДЗ. РАНІЦЫ ДА 23 ГАДЗ. УНАЧЫ. Тэлефон дзяжурных № 20-682.

УПАЎКАМЗАГ СНК СССР ПА БССР.

Паведамленьні

3-га ВЕРАСЬНЯ, у 7 гадз. веч., у памяш. аддз. кадраў ЦК КП(б)Б (пакой 31) СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА ЗАГАДЧЫКАЎ АДДЗЕЛАЎ КАДРАЎ—ПАРТЫЙЦАЎ усіх цэнтральных устаноў, наркаматаў, аб'яднаньняў, трэстаў і навучальных устаноў.

***

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 4-га верасьня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў Менску (Савецкая 55, пакой № 18) будзе працаваць партстройка ЦКК па разгляду спраў Лагойскага, Пухавіцкага і Чэрвеньскага раёнаў.

Выклікаюцца наступныя т. т.:

ПА ЛАГОЙСКАМУ РАЁНУ: Шмуклер К. М., Чарапан А. В., Насевіч Я. Я., Валахновіч Я. Х., Бялко Д., Грынфэльд Н. Ш., Жардзецкі Я. А., Станковіч А. В., Трутчанка Т. Ф., Кішкурна С. П., Ляшкевіч І. І., Вежан І. Я., Сокал В. В., Макейчык В. М., Бельскі В. І., Дзядзюля К., Войцік Я. А., Гілевіч С. П., Капля Я. Я., Аляшкевіч М. С., Савіч А. Т., Ражкоў Е. Ц.

ПА ПУХАВІЦКАМУ РАЁНУ: Кучук Я. І., Куніцкі Я. П., Шпакоўскі А. Р., Лукс, Гацкі А. Ф., Шыдлоўскі Ю. М., Галаўнёў В. П., Якімовіч А. С., Скорабагаты А. З., Мельнікаў К. А., Арлоўскі Я. К., Чычко С. К., Лаўрынюк Н., Васільковў В. А., Сіцко Т. П.

ПА ЧЭРВЕНЬСКАМУ РАЁНУ: Мартыновіч П. Р., Пілуй К. Ф., Рычагоў І. Ф., Андрончык Ул. Я., Белы М., Каракайцо З. А., Чэх, Касьцевіч В. А., Сакольчык М. П., Крыванос Н. Я., Вяргун Я., Вераб'ёў А. Л., Савіцкі А. М., Дзянісевіч Б. М., Кудрашоў.

Яўка памянёных т. т. абавязкова.

Выклікаемыя т. т. павінны прадставіць характарыстыкі партстройцы ад ячэйкі аб іх апошняй рабоце.

***

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. Лісоўскага Т. А., Сундукова М. С., Краінскага І. І., Кіпенварліца Т. К. і Фрыдлянда С. зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б, ці паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы (Менск, Савецкая, 55, 3 ці паверх, 18 пакой).

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых месца знаходжаньня паказаных таварышоў, паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

***

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 4 верасьня парткамісіяй ЦКК КП(б)Б будуць разгледжаны партсправы наступных таварышоў Смалявіцкага раёну:

Папкова П. П., Парфімовіча І .М., Чарняўскага А. В., Чыркуна Ўл. А., Мэрэзвіча М. С., Малаева Ў. Т., Конаша В. В., Шарамета Д. С., Акуліча В. Р., Красуцкага С. М., Зыля П. Зьм., Копця Я.

Яўка гэтых таварышоў на п/камісію абавязкова.

***

Культпроп Менгаркому КП(б)Б склікае 3-га верасьня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні дому Камасьветы (малы зал) нараду культпропаў п/к, арганізатараў вучобы цэх. ячэек і ўсіх прапагандыстых сеткі партасьветы па пытаньні аб задачах марксыцка-ленінскай вучобы на зімовы пэрыяд.

Яўка паказаных таварышоў абавязкова.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

***

Ніжэйпамянёныя таварышы павінны зьявіцца ў Менгарком КП(б)Б, (пакой № 38) 3-га верасьня а 6-й гадзіне ўвечары:

Скробава — ЦК КП(б)Б, Путырская— ЦК КП(б)Б, Круглік — ЦК КП(б)Б, Лернэр — Белкаапсаюз, Гуценкава — Белкаапсаюз, Вольпава — Наркамфін, Чакорская — Наркамфін, Крэсік — Дзяржбанк, Пятроўская — «Чырвоны крыж», Гельфанд — ГарКК, Сапдаценкава — ГарКК, Рубенчык — ГарКК, Лібо — ЦКК КП(б)Б, Баравая — Гарсавет, Бараноўская — Гарздраў, Рехніна — Гарсавет, Рудніцкая — зав. імя Варашылава, Кацнэльсон — Т-ва «Прыхільнік дзяцей», Айзэнсон — таксама, Басніна — Наркамцяжпрам, Дубровенская — таксама, Ярмолава — Наркамцяжпрам, Яльмір — Белхімлес, Элькінд — ЦРК, Чупрова — Наркамюст, Альдшупер — Наргасулік, Капляёва — ЦП швэйнікаў, Гарэлік—Ашчадкаса, Райх — Шклозавод, Шапіра — рад. «Работ. Калт.», Каган Соня — ЦКК КП(б)Б, Аксэльрод І., Касьцюк — Ашчадкаса, Дынэрштэйн — Наркамфін, Поташ — Дом Камасьветы.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

***

4 верасьня 1933 г. а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Каапэрацыі і Дзяржгандлю (былы клюб саўгандальслужачых) Гаркамісія па чыстцы і Гарпрафсавет склікаюць прафактыў устаноў і прадпрыемстваў, шэфствуючых над установамі па пытаньні «Удзел рабочых у праверцы і чыстцы партячэек савецкіх устаноў» — даклад тав. ХАДАСЭВІЧА.

Старшыням заўкомаў, фабкомаў і мясцкомаў забясьпечыць свячасовую яўку рабочых ударнікаў, сацнамесьнікаў, прафактыву і кіруючага складу работнікаў прадпрыемстваў і устаноў.

ГАРКАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.
ГАРПРАФСАВЕТ.

ДЗЯРЖЦЫРК
пачатак у 8 с пал. гадз. веч.
НОВАЯ ГРАНДЫЁЗНАЯ ПРАГРАМА
Гарадзкі сад

КОНКУРС АРТЫСТАЎ
Новыя атракцыёмныя нумары
МОРСКІЯ ЛЬВЫ—Роэз—Ласка
Монтано—амэрыканск.—індыйск. каўбойскі Рэнс—арыгінальн. акробаты—парадысты. Музычн. сатырыкі Вас і Вэйр злоба дня. Юліано—эквілібрысты. Лоо Амбатсо—паветраны палёт і яшчэ шмат іншых нумароў новага жанру

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“ — Мастацкі гістарычны фільм ДЗЬЮЕ КАРАЛЕВЫ (Дэроты Вернон) (Трагэдыя ў 10 частках).

Кіно Інтэрнацыянал — Замежны мастацкі фільм ВОЧЫ МЕРЦЬВЯКА. Драма ў 6 частках

КІНО СПАРТАК — Ад 3 верасьня ўсходні мастацкі фільм ДЗІКА ДЗА—ДЗУ. Драма ў 7 частках

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Прыгодніцкі кіно-фільм Дзіця дзяржцырку у 6 ЧАСТКАХ. Пачатак а 2 гадз. дня

РАГАЧОЎСКАЯ ДРЭВААПРАЦОЎНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА
працягвае асенні НАБОР